АЎТОРАК, 15 ЖНІЎНЯ 1933 г. № 187.

Адрас рэдакцыі і канторы: г. Віцебск, пляц Волі, Палац працы, трэці паверх.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА 2 р. у мес.
Цана асобн. нумару 8 кап.

Тэлефоны рэдакцыі: Сэкратарыят—1-73, нам. рэдактара, партыйны і нацыянальна-культурнага будаўніцтва сэктары—4-76, сэктары: прамысловы, сельска-гаспадарчы—72, рабочага снабжэньня і кааперацыі, савецкага будаўніцтва—6-15, начная рэдакцыя—4-56.

# ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

**СЁНЬНЯ Ў НУМАРЫ:**
Першы сэкратар ЦК КП(б)Б тав. М. Ф. ГІКАЛО ў Віцебску.—Прыезд у Віцебск тав. ГІКАЛО адзначым поўным завяршэньнем уборкі, бяз страт, высокаякасным праўдзеньнем абмалоту і датэрміновым выкананьнем збожжапаставак.
ЗА МЯЖОЙ: Кампартыя Германіі на баявых пазыцыях.

# Жалезнай бальшавіцкай дысцыплінай спаяем кожнае зьвяно віцебскай партарганізацыі.

У сёньняшнім нумары газэты мы публікуем пастанову аб'яднанага паседжэньня віцебскага гаркому і прэзыдыуму гарКК КП(б)Б па пытаньні аб фактах парушэньня партыйнай дысцыпліны ў час правядзеньня 9 жніўня агульнагарадзкога сходу партыйнага актыву.

Гэта пастанова мае глыбока-прынцыповае значэньне, як дакумант ПАСЬЛЯДОЎНАЙ і НЯЎХІЛЬНАЙ барацьбы за замацаваньне жалезнай бальшавіцкай дысцыпліны ў кожным зьвяне віцебскай партыйнай арганізацыі, «не зважаючы на асобы».

Цэнтральны камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове аб становішчы віцебскай арганізацыі асабліва ўпор зрабіў на неабходнасьць разгортваньня такой праверкі работы КОЖНАЙ ячэйкі, КОЖНАГА камуніста, якая-б са ўсёй БАЛЬШАВІЦКАЙ БЯЗЬЛІТАСНАСЬЦЮ ўдарыла па СЯМЕЙНАСЬЦІ, ГРУПАЎШЧЫНЕ, ДРОБНАБУРЖУАЗНАЙ РАСХЛЯБАНАСЬЦІ, маючых месца ў радзе зьвеньняў віцебскай партыйнай арганізацыі.

Адсутнасьць жалезнай бальшавіцкай дысцыпліны, разьвінчанасьць, расхлябанасьць, безадказныя адносіны да выкананьня партыйных даручэньняў, наскрозь гнілыя, тыпова сямейныя месьніцкія „установачкі", што „свае хлопцы—біць ня будуць", наскрозь гнілыя, абывацельскія развažаньні накшталт гутарак аб тым, што «пастанова аб дысцыпліне—верная, правільная, але яна датычыцца не мяне а майго суседа»—уся гэта ІРЖАЎЧЫНА, якая ўелася ў асобныя зьвеньні партыйнай арганізацыі, павінна быць моцнай бальшавіцкай рукой ачышчана з цела нашай, у асноўным, здаровай і моцнай арганізацыі.

Выключна завостраная ўвага і адпаведныя вывады намі павінны быць зроблены з таго факту, што найбольш значная група выключэньняў з партыі ў час праходзячай зараз чысткі віцебскай арганізацыі прыходзіцца на парушальнікаў партыйнай дысцыпліны.

Кожны камуніст, кожны камсамолец павінен са ўсёй глыбінёю і выразнасьцю зразумець, што жалезная дысцыпліна бальшавіцкіх радоў, непарыўна зьвязаная з барацьбой за сьмелае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі і яе баявую дзейснасьць,—першачарговая ўмова пасьпяховасьці барацьбы за генэральную лінію партыі, за ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб становішчы віцебскай арганізацыі.

ДНІ ЖНІЎНЯ ДЛЯ НАС, ДЛЯ ВІЦЕБСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ—РАШАЮЧЫЯ ДНІ

Баявая праверка перабудовы радоў віцебскай партыйнай арганізацыі, якая праходзіць пад знакам барацьбы за своечасовае завяршэньне ўборкі і абмалоту бяз страт, датэрміновае, высокаякаснае выкананьне збожжапаставак дзяржаве, правядзеньне асеньняй сяўбы, пад знакам барацьбы за поўнае выкананьне прадпрыемствамі прамфінплану—з асаблівай вастрынёй, з асаблівай сілай яшчэ і яшчэ раз абавязвае да безадкладнага замацаваньня сапраўды бальшавіцкай жалезнай дысцыпліны ў кожным зьвяне віцебскай партыйнай і камсамольскай арганізацыі, у кожным зьвяне нашых савецкіх і гаспадарчых устаноў, у кожным зьвяне прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый.

ЗА НЕСАКРУШАЛЬНУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ!

ЗА НЕПРЫМІРЫМУЮ БАРАЦЬБУ НА ДВА ФРАНТЫ, З АПАРТУНІСТАМІ ЎСІХ МАСЬЦЕЙ І АДЦЕНЬНЯЎ, З ПРАВЫМ УХІЛАМ—ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ, З „ЛЕВЫМІ" ЗАГІБАМІ І ПРЫМІРЭНЦТВАМ ДА ЎХІЛАЎ!

ЎРАГАННЫ АГОНЬ ПА ПАРУШАЛЬНІКАХ БАЛЬШАВІЦКАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ!

БЯЗЬЛІТАСНАЯ БАРАЦЬБА МАЛЕЙШЫМ ПРАЯВАМ ГНІЛА-ЛІБЭРАЛЬНЫХ АДНОСІН ДА ПАРУШАЮЧЫХ АСНОВУ АСНОЎ НАШАЙ ПАРТЫІ—НЕПАХІСНУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ!

МОЦНА СПАЯЕМ КОЖНАЕ ЗЬВЯНО НАШАЙ АРГАНІЗАЦЫІ!

ЖАЛЕЗНАЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ДЫСЦЫПЛІНАЙ, РАЗГОРТВАНЬНЕМ САМАКРЫТЫКІ, БАРАЦЬБОЮ ЗА ЯЕ ДЗЕЙСНАСЬЦЬ, ВЫШЭЙ УЗЬНІМЕМ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ КОЖНАГА ЗЬВЯНА АРГАНІЗАЦЫІ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПАСТАНОЎ ЦК УсеКП(б) І ЦК КП(б)Б АБ ВІЦЕБСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ!

# АБ ФАКТАХ ПАРУШЭНЬНЯ ПАРТДЫСЦЫПЛІНЫ У ЧАС ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПАРТАКТЫВУ 9 ЖНІЎНЯ.

*Пастанова бюро віцебскага гаркому і прэзыдыуму гарКК КП(б)Б ад 12-га жніўня 1933 г.*

1. Канстатаваць, што ў паасобных ячэйках дагэтуль ня зжыты праявы грубай недысцыплінаванасьці, расхлябанасьці, безадказнасьці, яркім падцьверджаньнем чаго зьяўляюцца ганебныя факты, меўшыя месца пры правядзеньні партактыву, прысьвечанага абгаварэньню важнейшых рашэньняў ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б (спазьненьні, няўважлівыя адносіны да работы актыву, уход раду камуністаў да сканчэньня актыву).

2. Бюро ГК КП(б)Б і прэзыдыум гарКК з асаблівай рэзкасьцю падкрэсьліваюць, што канкрэтнымі носьбітамі гэтых ганебных праяў зьявіліся паасобныя сэкратары ячэек, якія, замест прыкладу бальшавіцкай дысцыплінаванасьці, самавольна пакінулі актыў (гартоп—ЛЕВІНСОН, малочны завод—ШЭЛЕКТАР, фабрыка „Прафінтэрн"—ПАМЕРАНЕЦ).

Расцэньваючы праявы грубага парушэньня партдысцыпліны на актыве, як недаацэнку палітычнага значэньня важнейшых рашэньняў пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, маючых асабліва важнае значэньне ва ўмовах наяўнасьці глыбейшых прарываў у рабоце віцебскай партарганізацыі, падкрэсьленых пастановай бюро ЦК КП(б)Б аб Віцебску,—бюро ГК і прэзыдыум гарКК КП(б)Б пастанаўляюць;

1. Абавязаць бюро парткалектываў і ячэек на чарговых партсходах абгаварыць пытаньне аб становішчы партдысцыпліны, шырока разгарнуўшы самакрытыку вакол канкрэтных праяў недысцыплінаванасьці ва ўмовах сваёй партарганізацыі, разам з тым абгаварыўшы факты парушэньня партдысцыпліны, праяўленыя на партактыве 9 жніўня г.г., прыняўшы меры жорсткага партыйнага ўзьдзейнічаньня ў адносінах да канкрэтных носьбітаў дробнабуржуазнай распушчанасьці, расхлябанасьці, недысцыплінаванасьці.

Аргаддзелу ГК КП(б)Б у дэкадны тэрмін распрацаваць і ўнесьці на разгляд бюро пытаньне аб выхаваўчай рабоце з актывам.

2. Сэкратаром ячэек гартопа т. ЛЕВІНСОНУ і малочнага завода т. ШЭЛЕКТАРУ абвясьціць суровую вымову і зьняць іх з работы сэкратароў ячэек.

3. Папярэдзіць сэкратара парткалектыву фабрыкі „Прафінтэрн" т. ПАМЕРАНЦА, што ў выпадку паўтарэньня з яго боку фактаў малейшага парушэньня партдысцыпліны, у адносінах да яго будуць прыняты меры суровага партузьдзейнічаньня.

4. Аддзелам ГК КП(б)Б у далейшай рабоце па арганізацыі масавых мерапрыемстваў (сходы, канфэрэнцыі, актыў, масоўкі) устанавіць точную праверку падрыхтаванасьці гэтых мерапрыемстваў на мясцох з боку парткалектываў і ячэек.

Сэкратар гаркому КП(б)Б І. ЖУРАЎЛЁЎ.
Старшыня гарКК КП(б)Б АВЕРЫН.

# Першы сэкратар ЦК КП(б)Б т. М. Ф. ГІКАЛО у Віцебску.

У Віцебск прыехаў першы сэкратар Цэнтральнага камітэту КП(б)Б тав. М. Ф. ГІКАЛО, які зараз робіць паездку па паўночнай групе раёнаў БССР. Тав Гікало да прыезду ў Віцебск пабываў у радзе паўночных раёнаў (Полацак, Асьвея і г. д.), асабіста правяраў і знаёміўся з ходам работ па ўборцы, абмалоце і збожжапастаўках дзяржаве.

# Ніякіх спасылаńняў на дрэннае надвор'е!

Галоўнае ва ўборцы—правесьці жніво бяз ніякіх страт, ва ўстаноўленыя тэрміны, ня даць збожжу перастаяцца на корані і асыпацца і ў гэты-ж час прасушанае збожжа хутка і па-гаспадарску звазіць на малацільныя токі, разгортваючы малацьбу і паралельна з ёю безадкладную арганізацыю датэрміновай здачы лепшага збожжа дзяржаве.

Такім чынам, ліквідацыя РАЗРЫВУ паміж жнівом, возкай і абмалотам, поўнае скарыстаньне для работ па ўборцы кожнай сонечнай гадзіны—наша баявая безадкладная задача.

Між тым, гэтыя элемэнтарныя рэчы часта ня хочуць улічыць кіраўнікі асобных калгасаў, асобных сельсаветаў.

Возьмем, да прыкладу, ЯЛАГІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ. На 12 жніўня па сельсавеце было зжата 406,2 га азімыны і ярыны, а зьвезена з поля было ўсяго на-ўсяго з 63,5 га і змалочана збожжа з 39 га. І ў гэты-ж час на палёх буйнейшага калгаса Ялагінскага сельсавету—імя Чырвонай арміі амаль усё жыта ляжыць вусім прасохшае. Гэты факт кажа аб тым, што выключна добрае надвор'е 12 жніўня кіраўнікі калгаса імя Чырвонай арміі «ПРАШЛЯПІЛІ», не скарысталі для таго, каб арганізаваць КРУГЛАСУТАЧНУЮ возку снапоў з поля на малацільныя такі.

Такім чынам, НЕ НАДВОР'Е, а людзі, КАНКРЭТНЫЯ ЛЮДЗІ, якія маюць і імёны і прозьвішчы, вінаваты ў затрымках з уборкай, абмалотам і здачай дзяржаве, вінаваты ў затрымках, якія ільлюць ваду на млын клясавага ворага ў яго падрыўной рабоце супроць нас.

Своечасова выкрываць факты гэткай апартуністычнай бязьдзейнасьці, НЕ ДАВАЦЬ АПАРТУНІСТАМ МАГЧЫМАСЬЦІ ХАВАЦЦА ЗА ШЫЛЬДАЮ СПАСЫЛАНЬНЯ НА ДРЭННАЕ НАДВОР'Е—наша баявая задача.

Аб тым, што справа не ў надвор'і, а ў жывых людзях, у іх жаданьні па бальшавіцку арганізаваць справу—яскравей за ўсё кажа ход уборкі ПА ШУМНЯНСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ.

Змаглі-ж шумнянцы (старшыня сельсавету тав. Арлоўскі, упаўнаважаны ГК тав. Хвясюк) на 13 жніўня выканаць увесь плян азімага жніва, зьвезьці з поля 405 га (70 проц зжатага), здаць дзяржаве 19 700 кгр збожжа, адначасова паралельна пасьпяхова арганізаваць жніво ячменю (выканаўшы плян на 60 проц) і, не паддаючыся галавакружэньню ад посьпехаў, працягваць са ўсёй бальшавіцкай настойлівасьцю справу ўмацаваньня барацьбы за тэмпы і якасьць уборкі, абмалоту і збожжапаставак дзяржаве.

А ХІБА-Ж У ШУМНЯНАХ НЯ БЫЛО ТАКОГА-Ж НАДВОР'Я, ЯК У ЯЛАГАХ І ІНШЫХ СЕЛЬСАВЕТАХ РАЁНУ?!

ВЫВАД адсюль адзін—НЕ РАЗМАГНЭСВАЦЦА, даваць своечасова адпор апартуністычным спасылаńням на дрэннае надвор'е, умець сапраўды па бальшавіцку АРГАНІЗОЎВАЦЬ СПРАВУ, умець праяўляць гаспадарскую сьмякалку, ініцыятыўнасьць, умець скарыстоўваць кожны мала-мальскі паыходзячы дзень і падыходзячую гадзіну, умець мабілізаваць усіх ад малада вяліка на самую хутчэйшую звозку збожжа з поля, каб папярэдзіць яго псаваньне, расхішчаньне злодзеямі і жулікамі, папярэдзіць вялікія страты ад перастою

ДАМО БЯЗЬЛІТАСНЫ АДПОР КУЛАЦКІМ СПРОБАМ ЯКІМІ-Б ТА НІ БЫЛО СПАСЫЛАНЬНЯМІ НА ДРЭННАЕ НАДВОР'Е САРВАЦЬ СПРАВУ ЎБОРКІ, АБМАЛОТУ І ДАТЭРМІНОВАГА ВЫСОКАЯКАСНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ЗБОЖЖАПАСТАВАК ДЗЯРЖАВЕ

## Пакараць вінаўных у давядзеньні сустрэчных плянаў і адначасова даваць рашучы адпор спробам захаваньня пасеўнай плошчы ад давядзеньня абавязацельстваў

Даўжанскі сельсавет па калгасным сэктары засеяў 360 га азімага жыта і 2 га азімай пшаніцы. На гэтую колькасьць сельсаветам дадзена ў гарЗА заключная зводка аб пасеве азімага жыта.

Зусім ясна, як трэба было налічваць калгаснаму сэктару абавязацельствы па цьвёрдых пастаўках азімага жыта СНК СССР і ЦК УсеКП(б) указалі, што абавязацельствы па азімых налічваюцца толькі з фактычна засеянай плошчы.

Аднак, намесьнік старшыні гарсавету МОІН і інспэктар па загатоўках КАЗАК злачынна парушылі новы закон аб цьвёрдых збожжапастаўках.

Тав. Моін, зьяўляючыся ўпаўнаважаным ГК КП(б)Б па веснавой сяўбе ў Даўжанскім сельсавеце, добра ведаў аб колькасьці засеянага жыта па калгасным і аднаасобным сэктарох. Аднак, т. Моін дагэтуль не палічыў патрэбным выправіць дапушчаныя памылкі ў налічэньні збожжапаставак па азімых, а ўзяў за аснову для налічэньня ня плошчу засеву з заключнай зводкі, а плошчу з давядзенага асеньняга пасеўнага пляну. і, ў рэзультаце, атрымалася, што абавязацельствы па збожжапастаўках азімых давядзены звыш фактычна засеянай плошчы на 49 га.

Вось прыклад. Калгасу „СІЛАЧ" плян азімага жыта быў давядзены на 120 га, засеяна 85 га жыта і 2 га пшаніцы. Такая лічба стаіць у заключнай зводцы і паступова менш у папярэдніх. Здавалася б, што на 87 га павінна была быць і давядзена абавязацельства па збожжапастаўках азіміны. Але гэта зусім ня так. Абавязацельствы давядзены на ўсіх 120 га. Такім чынам, на 33 га плян давядзены звыш засеянага. У калгасе ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» таксама.

Па сельсавеце яшчэ маецца частка аднаасобнікаў (5—6 гаспадарак), якім яшчэ ня выпісаны і не давядзены абавязацельствы па збожжапастаўках. Гэтыя аднаасобнікі жывуць у вёсцы Сафонава (па словах старшыні сельсавету ПІСКУНОВА—гэта вёска выпала з поля зроку, праўдзівей, забылі пра яе)

Неабходна выправіць дапушчаныя памылкі ў давядзеньні абавязацельстваў да калгасаў «Сілач», «Інтэрнацыянал» і адначасова даць самы жорсткі адпор спробам праўмяншэньня альбо захаваньня часткі пасеваў ад давядзеньня да іх цьвёрдых збожжапаставак дзяржаве. СУРГАНАЎ.

ЖНІВЕНЬ—РАШАЮЧЫ МЕСЯЦ БАРАЦЬБЫ ЗА ЎБОРКУ І ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЗБОЖЖАПАСТАВАК.

# Прыезд у Віцебск тав. ГІКАЛО адзначым поўным завяршэньнем уборкі, бяз страт, высокаякасным правядзеньнем абмалоту і датэрміновым выкананьнем збожжапаставак.

## ХОД УБОРКІ ПА РАЁНЕ НА 13-е ЖНІЎНЯ.

НА 13 ЖНІЎНЯ СКОНЧАНА ЖНІВО АЗІМАГА ЖЫТА ПА ВАВІНІЦКІМ, БАРАЎЛЯНСКІМ, ВЯЛІКА-ЛЁТЧАНСКІМ. ЗАМАСТОЦКІМ, МАШКАНСКІМ. МІКАЛАЕЎСКІМ, МІХАЛЁЎСКІМ СЯЛЮЦКІМ, ЯЛАГІНСКІМ І ШУМНЯНСКІМ СЕЛЬСАВЕТАХ.

ПА ВІЦЕБСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ ЗАСТАЛОСЯ ЗЖАЦЬ 36 ГЭКТАРАЎ, ПА ДАЎЖАНСКІМ—20,3 ГА, РУДНІЦКІМ—4 ГА, РУДАКОЎСКІМ—16 ГА, СТАРАСЕЛЬСКІМ 10,3 ГА.

НА 13 ЖНІЎНЯ ПЛЯН ЖНІВА ПА КАЛГАСНА-СЯЛЯНСКІМ СЭКТАРЫ ПА РАЁНЕ ВЫКАНАНЫ НА 90%. ЗЬВЕЗЕНА З ПОЛЯ 36,1 ПРОЦ. ЗЖАТАГА. ЗЖАТА ЯРАВОГА ЖЫТА 75.2 ГА, АЗІМАЙ ПШАНІЦЫ 24,6 ГА, ЯЧМЕНЮ—44,6 ПРОЦ., ЗЬВЕЗЕНА З ПОЛЯ ЯЧМЕНЮ 26,4 ПРОЦ. ЗЖАТАГА. ЗЖАТА ТАКСАМА 17,8 ГА АЎСУ. ВЫЦЕРАБЛЕНА 26 ГА ІЛЬНУ; СКОШАНА ВІКІ НА КОРМ 109,2 ГА.

## У КАЛГАСАХ „ПАБЕДА" І „МОЛАТ" СЬВІРНЫ НЕ ГАТОВЫ ДА ПРЫЁМУ НОВАГА ЎРАДЖАЮ.

У калгасах Вяліка Лётчанскага сельсавету не падрыхтаваны сьвірны да прыёмкі новага ўраджаю, а самы разгар абмалоту—наступіў. Не падрыхтаваны яны і ў калгасе «Пабеда».

Старшыня калгасу Багавенка толькі зараз пачынае думаць, як падрыхтаваць сьвірны. Дэзынфэкцыя сьвірнаў да гэтага часу ня зроблена, нягледзячы на рад пастаноў праўленьня калгаса. Кладаўшчык Паўлючэнка пастаноў праўленьня ня выканаў. Закрамы ў сьвірнах засьмечаны, аб ачыстцы іх ніхто ня думае. У адным з іх парвана страха і яе не рамантуюць.

У калгасе «Молат» да гэтага часу ня ведаюць, дзе ў іх будуць сьвірны. Старшыня калгаса Пухавіцкі не займаецца справай падрыхтоўкі іх да хаваньня збожжа.

Крыху лепш абстаіць справа ў калгасе «Бяроза», дзе пачалі вытвараць дэзынфэкцыю сьвірнаў.

Парт'ячэйка і сельсавет гэтым пытаньнем ня цікавяцца і патураюць зрыву падрыхтоўкі да прыёмкі збожжа. Гэтым пытаньнем неабходна зараз-жа заняцца. Вінаватых патрэбна прыцягнуць да адказнасьці.

Р. Васільлеў, Басін.

## Сабатажнікаў хлебаздачы—да суровай адказнасьці.

Нягледзячы на шматлікія ўказаньні аб датэрміновай пастаўцы збожжа дзяржаве, асобныя кіраўнікі калгасаў Вяліка Лётчанскага сельсавету яўна іх сабатуюць

Старшыня калгаса „Культурны фронт" ТЫШЭВІЧ ня здаў ніводнага кілёграму хлеба, спасылаючыся на адсутнасьць прасохшага жыта, і ня прымае ніякіх мер да абмалоту сьпелага жыта. Сваімі разважаньнямі Тышэвіч грае на руку клясаваму ворагу

Ганебна зрывае хлебапастаўкі калгас «Бяроза»—самы буйны калгас у Вяліка-Лётчанскім сельсавеце. Старшыня калгаса ЮРЧАНКА ідзе па сьледох былога кіраўніцтва (Шымановіча і Царкоўскага) на зрыў хлебазагатовак. Юрчанка не дае ніякага адпору шкодным разважаньням аб тым, каб горшае збожжа здаваць дзяржаве.

Тышэвіч і Юрчанка павінны быць прыцягнуты да адказнасьці, як сабатажнікі збожжапаставак. Р.

## ВАРТАЎНІКІ ПІЛЬНА... СЬПЯЦЬ.

У калгасе «БЯРОЗА», Вяліка-Лётчанскага сельсавету, пасьля раду фактаў крадзяжу калгаснай маёмасьці, пасьля таго, як кулацкія «парыкмахеры» сурова асуджаны (аднаасобніца Цьвяткова асуджана на 10 год пазбаўленьня волі) здавалася-б, што павінна ўмацавацца клясавая пільнасьць і добра наладжана ахова калгаснай маёмасьці. Аднак, начны рэйд «лёгкай кавалерыі» і брыгады КСМ у ноч на 8 жніўня паказаў наступнае:

Гадзіна ўначы. Брыгада прайшла амаль увесь калгас і яе ніхто не затрымаў. Хадзілі каля бабак жыта, па садзе, бы і на гародах, і нідзе ніхто нас ня сустрэў. Ня бачна было нават прызнакаў аховы палёў вартаўнікамі. Прайшоўшы палі калгаса пранікаем у цэнтр калгаса, дзе знаходзяцца жывёла, амбары, кладавыя, сараі са збожжам, пуні з сенам. Нідзе не адчуваецца варта. Нарэшце знаходзім усё-ж такі аднаго вартаўніка—сьпіць ён прытуліўшыся ля ганку, вінтоўка ля боку яго. Мы бяз усякіх перашкод забіраем у соннага вінтоўку і адыходзім. Адышоўшы, мы пачалі шумець, але вартаўнік ЛІВАНЕНКА працягваў спаць.

Ідзём далей, пранікаем у пуню, у ток са збожжам—нікога нідзе няма. Абышоўшы ўвесь калгас, пры звароце назад мы знайшлі каля току спаўшага на саломе вартаўніка Салаўёва. Мы абышлі яго, разбудзілі. Ён у нас пытае: „ХТО ВЫ ТАКІЯ?"—мы яму нічога не адказалі і пайшлі далей. На гэта ён ніяк не рэагаваў.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што калгасьнікі яшчэ не зразумелі важнасьці барацьбы за ахову ўраджаю Для прыкладу іншым неабходна зараз-жа прыцягнуць да суровай адказнасьці гэтых гора-вартаўнікоў.

Рэйдавая брыгада: ГЕЙНІН, БЕЛЬЧЫКАЎ, ПАЎЛАЎ, ЯЎСЕЕВА, ЧАРНІН.

## ДЗЁНЬНІК РАБОТЫ МАЛАТАРНІ МК-1100.

11 жніўня.

*(Калгас імя Чырвонай арміі, Ялагінскага сельсавету).*

◆ Малатарня пачала работу а 8 гадз. раніцы і скончыла работу а 22 гадз. Вытваралася малацьба ячменю.

◆ З-за няспраўнасьці трактара «Інтэр» малатарня стаяла з 9 да 18 гадз. З-за паломкі саломатрасу малатарня прастаяла з 21 гадз. 30 м. да 22 гадз. Дзяжурны машыніст—КОЛАСАЎ МІКОЛА.

◆ Малатарню абслугоўваюць 15 чал. у зьмену, 2 трактарысты і калёнаважаты АРЛОЎСКІ. Дзяжурны, прымацаваны гаркомам партыі, тав ПАЎЛАЎ.

◆ Малатарня змалаціла 3.450 клгр. ячменю замест нормы за гэты час работы ў 11200 клгр.

◆ БАЛЯНС РАБОТЫ МАЛАТАРНІ: карысная работа складае 4,5 гадз. За гэты час работы, малатарня павінна была даць 3.600 клгр., дала 3450, такім чынам машына недавыканала за 4,5 гадз. 150 клгр.

Ячмень, які падвозіцца да малатарні, звальваецца і тут-жа топчыцца людзьмі і конямі.

Неабходна неадкладна дабіцца поўнага выкананьня нормы ў 160 цэнтн. на 20 гадз., што зьяўляецца цалкам рэальным пры бесьперапыннай рабоце.

## *Дзёньнік збожжапаставак.*

◆ КАЛГАС „БАЛЬШАВІК", Машканскага сельсавету, 10 жніўня завяршыў пастаўку жыта дзяржаве. Здадзена 48,5 ц. што складае 100 проц. пляну. Калгасьнікі ўзялі на сябе абавязак скончыць высокаякасныя збожжапастаўкі ўсіх культур да 20 жніўня. Зараз узмоцненымі тэмпамі ідзе жніво аўсу і ячменю.

◆ ВЁСКА ЛЯХАВА, Машканскага сельсавету, 9 жніўня выканала гадавы плян пастаўкі жыта дзяржаве—здадзена 903 клгр. Працоўныя аднаасобнікі вёскі Ляхава выклікалі на спаборніцтва працоўных аднаасобнікаў з вёскі «Лясная слабада» на хутчэйшае сканчэньне збожжапаставак

◆ АДЗІН З АДСТАЮЧЫХ калгасаў па Машканскім сельсавеце—калгас «Кастрычнік». З гэтата калгаса дзяржаве здадзена жыта толькі 10 проц. пляну. Старшыня калгаса Бараноўскі і ўпаўнаважаныя ГК КСМ ФРЫДМАН І ЛЕВІН злачынна бязьдзейнічаюць, патураюць зрыву абмалоту і гэтым самым зрываюць збожжапастаўкі.

АСТАПАЎ.

◆ НА 100 ПРОЦАНТАЎ плян збожжапаставак жыта выканаў калгас „Молат", Вяліка Лётчанскага сельсавету. На 12 жніўня здадзена 40 36 ц. жыта. Калгасьнікі рыхтуюцца да здачы ячменя.

◆ НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА РАД СЫГНАЛАЎ і ўказаньняў аб тым, што сырое жыта ня прымаецца, старшыня калгаса «Культурны фронт» ТЫШЭВІЧ, усё-ж такі накіроўвае жыта з вільготнасьцю на 23 проц.—на загатоўчыя пункты. 11 жніўня загатоўчы пункт зьвярнуў 46 ц. жыта, з прычыны вялікай яго вільготнасьці.

ВАСІЛЬЛЕЎ.

◆ 12 жніўня з калгаса імя Кліма Варашылава, Міхалёўскага сельсавету, на загатоўчы пункт было прывезена 25 ц. жыта. Аднак, у лік паставак яно ня прынята з прычыны засьмечанасьці на 13 проц Возчыкам Уласенка і Махоўскаму было прапанавана адсартаваць гэта жыта на трыеры аднак апошнія адмовіліся і павезьлі яго назад.

◆ Кулацкія перараджэнцы з калгаса «Шлях да сацыялізму», Рудніцкага сельсавету Сьцяпанаў (старшыня калгаса) і Новікаў (брыгадзір ГК КП(б)Б) з першага абмалоту жыта разьмеркавалі сярод калгасьнікаў, пры чым разьмеркавалі па прынцыпе кулацкай ураўнілаўкі, а не забесьпячэньня першачарговай датэрміновай здачы збожжапаставак дзяржаве і адначасовай выдачы 10 проц. усяго абмалочанага хлеба ў выглядзе авансаў (выключна па працаднях).

Пастановай прэзыдыуму сельсавету Сьцяпанаў зьнят з работы і аддадзен пад суд, а справа брыгадзіра Новіка ва перададзена на разгляд гаркому партыі.

ІВАНОЎ.

◆ За 12 жніўня на пункце № 1 (па Шасэйнай вул.) прынята ад калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў у лік паставак збожжа дзяржаве 31 тона жыта, 3 тоны ячменю На пункце № 2 (па Смаленскім шасэ) прынята 15,9 тоны жыта і 35 кг ячменю.

На пункце № 3 (Сураскае шасэ) у лік паставак збожжа дзяржаве прынята 10 тон 635 кг жыта

Разам па раёне прынята 57 тон 535 кг. жыта і 3 тоны 35 кг ячменю.

# Выйсьці сапраўды ў перадавыя рады мясцовай прамысловасьці.

У зводцы па выкананьні прамфінпляну мясцовай прамысловасьці за ліпень наперадзе ўсіх прадпрыемстваў ідзе абутковая фабрыка «Прагрэс».

91,7 проц. выкананьня пляну далі ўжо права «Прагрэсу» выйсьці на першае месца сярод прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці. Ужо гэты факт красамоўна гаворыць аб зусім нездавальняючай рабоце мясцовай прамысловасьці нашага гораду.

Калі за першае паўгодзьдзе гэтага году «Прагрэс» выканаў плян на 92,1 проц., то за ліпень выкананьне зьнізілася на 91,7 проц. За 7 месяцаў фабрыка запазычыла дзяржаве 3900 руб.

Дырэктар фабрыкі тав. Пальман аперыруе лічбай 7,6 проц. падняцьця прадукцыйнасьці працы на кожнага рабочага. І здавалася-б, што на гэтым фронце ўсё ў парадку, але, калі мы скажам, што заработная плата на аднаго рабочага за гэты-ж тэрмін вырасла на 12 проц., фонд заработнай платы перавыдаткаваны на 1941 руб., дык стане зусім яскравым, што і тут далёка ненармальна. Такая разьбежка паміж ростам прадукцыйнасьці працы і заработнай платы зусім недапусьціма. Кіраўніцтву фабрыкі трэба зараз-жа прыняць усе захады да зьнішчэньня гэтых хваробных зьявішчаў, патрэбна больш жорстка праводзіць фінансава гаспадарчы рэжым

Нельга прайсьці міма такіх лічбаў. Замест 8 проц. зьніжэньня сабекошту фабрыка за сем месяцаў зьнізіла сабекошт на 6,8 проц. у параўнаньні з 1932 годам, а докладны цэх ня толькі зьнізіў сабекошт, але і павысіў яго на 8 проц. супроць намечанага пляну.

### ДРЭННАЯ ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ—АДЗНАКА ДРЭННАЙ РАБОТЫ ФАБРЫКІ.

— Паляпшэньне якасьці—адно з асноўных патрабаваньняў, якое прад'яўляюць нам партыя і ўрад. Добрая якасьць прадукцыі ёсьць адзнака добрага прадпрыемства. Добрая якасьць—адзнака добрай работы.

Вось гэту думку выказаў народны камісар лёгкай прамысловасьці СССР тав. Любімаў, будучы ў Віцебску, пры азнаямленьні з работай лёгкай прамысловасьці нашага гораду.

Калі з гэтага пункту разглядзець работу абутковай фабрыкі „Прагрэс", дык мы, ня хістаючыся, скажам, што «Прагрэс» працуе нездавальняюча, працуе дрэнна.

Вельмі часта нам прыходзіцца слухаць скаргі спажыўцоў, што пасьля аднаго альбо двух разоў ноські абутку заднікі садзяцца, падмёткі адлятаюць. І вось тут, на абутковай фабрыцы „Прагрэс" можна знайсьці нават і без вялікіх цяжкасьцяў віноўнікаў выпуску гэтай ганебнай прадукцыі. Да гэтага ганебнага зьявішча прыводзіць сыры доклад, прыбўка гумавых падэшваў на неадпаведны нумар тэксу.

Докладны цэх зьяўляецца самым галоўным віноўнікам дрэннай якасьці прадукцыі на фабрыцы. Загадчык цэху ГІНЗБУРГ ня прымае рашучых захадаў для высушкі докладу, ад чаго скалодка атрымоўваецца нядобраякаснай. З-за докладнага цэху часта тыя прастоі другіх цэхаў.

А запытайце ў тав. Гінзбурга: хто ў яго бракароб? Хто псуе якасьць прадукцыі?—ён сьцяпнецца плячыма і адкажа: «Здаецца, у мяне ўсе ўдарнікі, усе працуюць як сьлед». Так, гэта праца «як сьлед» прыводзіць да псаваньня вялікай колькасьці прадукцыі.

### З БРАКАРОБАМІ ЗМАГАЮЦЦА ПА-СЯМЕЙНАМУ.

Ніякага вучоту якасьці прадукцыі на «Прагрэсе» няма. З бракаробамі тут змагаюцца па сямейнаму: зробіць хто брак, зьвернуць яму назад і ён пераробіць. Пераробляюць тады, калі знаходзяць жахлівы па сваёй нягоднасьці брак, а „дробны брак" не перарабляюць. «Спажывец зносіць, ня так страшна!»—думаюць загадчыкі цэхаў на абутковай.

Кожны цэх мае сваіх „герояў" браку. Вось возьмем шытвы цэх. САВІЦКІ РЫГОР і СОБАЛЁЎ вядомы сваёй дрэннай якасьцю. У скалодачным цэху хранічны брак дае ПОЛАЦКІ, БУЕВІЧ, падзельшчык, ЭСКІН і БЭЙЗЕР—скалодчыкі таксама далёка не адстаюць ад Полацкага. Бракаробы ў наяўнасьці. Аб іх гавораць загадчыкі цэхаў, аб іх гавораць рабочыя і... на гэтым застаецца. Бракаробы не караюцца.

Першачарговай неадкладнай задачай фабрычных і цэхавых арганізацый—наладзіць вучот браку, дабіцца зьніжэньня браку да нуля. Гэта можа зрабіць толькі тады, калі будзе весьціся непрымірымая бальшавіцкая барацьба супроць кожнага віду браку і недабраякаснай прадукцыі. Гэта можна зрабіць толькі тады, калі мы дадзім маральна і матар'яльна адчуваць бракаробам, што яны ворагі прадпрыемства, што яны ганьбяць фабрыку.

### РАЎНАНЬНЕ ПА ЗАКРОЙНА-ЗАГАТОВАЧНЫМ.

На фоне адставаньня ўсёй фабрыкі трэба адзначыць перадавікоў. Добрых ударнікаў мы маем па ўсіх цэхах. Вось па шытным цэху лепшыя ўдарнікі СУХАРОЎ і АБРАМКІН выконваюць прамфінплян на 130 проц. і даюць добрую якасьць. Па скалодачным цэху ўдарнікі СОСМАН, САПЕРСОН, ПЭРЛІН выконваюць штодзённа прамфінплян на 115—120 проц. пры добрай якасьці прадукцыі. Ва ўсіх мерапрыемствах, праводзімых на фабрыцы, гэтыя перадавікі даюць тон, паказваюць узоры бальшавіцкай работы Але гэтыя ўдарнікі яшчэ не дабіліся падцягваньня адстаючых рабочых у цэху, не дабіліся выкананьня прамфінпляну ў сваім цэху.

Пераможцамі зьяўляюцца ўдарнікі закройна-загатовачнага цэху, цэху, які за апошнія месяцы ня ведае прарыву. Закройна-загатовачны цэх адзіны на фабрыцы, які з дэкады ў дэкаду выконвае прамфінплян (загадчык цэху—ПЭРЛІН А.) За першую дэкаду жніўня закройна-загатовачны ўжо перавыканаў плян на 458 пар загатовак.

МІЛЛЕР, КАЗАК, ЛЕВІН, ГІЛЬДЗІН—лепшыя ўдарнікі цэху. Яны заваявалі права на гэтую назву штодзённым перавыкананьнем плянаў, узорнай якасьцю, актыўнай барацьбой супроць усіх тых перашкод, ненармальнасьцяў, на шляху пераможнага ходу закройнага цэху ў выкананьні свайго вытворчага заданьня па ўсіх яго паказчыках. Гасразьліковая брыгада ГІЛЬДЗІНА дала за першае паўгодзьдзе эканоміі 1272 рублі, дзякуючы беражлівым адносінам да верхняга тавару.

Усе цэхі абутковай фабрыкі «Прагрэс» павінны трымаць раўнаньне па закройна-загатовачнаму і тады фабрыка ў сапраўднасьці будзе перадавая сярод усіх прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці.

САПГІР (рабочы фабрыкі «Прагрэс»), КАЗАНСКІ.

## „ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК" ВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ ПА МАШЫНАФАРМОВАЧНЫХ ТОРФЕ НА 100,4 ПРОЦАНТА.

**Гаркому партыі, гарсавету, газэце „Віцебскі пралетары" і Тэкстыльтрэсту.**

На падставе выкананьня рашэньняў ЦК КП(б)Б, правільнай арганізацыі і расстаноўкі рабочай сілы, торфзавод «Чырвоны тарфянік» 10 жніўня выканаў сэзоннае заданьне па машынафармовачным торфе на 100,4 проц. Працягваем здабычу торфу ў лік перавыкананьня пляну.

ТРЫКУТНІК.

ЧЫСТКА І ПРАВЕРКА РАДОЎ ПАРТЫІ.

# Палітвыхаваучай рабоце сярод членаў і кандыдатаў партыі—максымум увагі.

У час чысткі парткалектыву фабрыкі імя КЛАРЫ ЦЭТКІН праверкомам пераведзены з членаў партыі ў кандыдаты і з кандыдатаў—у спачуваючыя 30 чалавек, як палітычна няпісьменныя. Ужо самая лічба важа аб тым, што да чысткі сваіх радоў парткалектывы зьвярталі вельмі малую ўвагі на палітычную падрыхтоўку партыйцаў.

Як-жа парткалектыў улічыў урокі чысткі? Трэба прама сказаць, што цяпер, як і да чысткі партыйная вучоба і палітвыхаваўчая работа сярод партыйцаў амаль не праводзіцца.

Асабліва бястурботныя адносіны бюро парткалектыву на чале з тав. ЖУРАВЫМ праяўляе да палітвыхаваўчай работы сярод пераведзеных у кандыдаты і спачуваючыя. Між тым, трэба адзначыць, што рад пераведзеных у кандыдаты і спачуваючыя тт. правільна зразумелі свой перавод і пасьля чысткі паказваюць лепшыя прыклады барацьбы за прамфінплян, ЗНАЧНА ПАВЫСІЛІ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ ДА ЛІКВІДАЦЫІ СВАЁЙ ПАЛІТЫЧНАЙ І АГУЛЬНАЙ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ

Тав. РУБІНА (мотальны цэх) за час чысткі (за ліпень) выканала свой плян на 125,5 проц. Тав. ШАГАЛАВА (вязальны цэх) за ліпень выканала плян на 108,42 проц. Тав. КУРЫЛЕНКА (мотальны цэх) за гэты-ж месяц выканала плян на 140 проц.

Але, нягледзячы на тое, што пасьля чысткі прайшоў ужо цэлы месяц, бюро партыйнага калектыву і цэхавыя ячэйкі ні разу не склікалі гэтых таварышоў, не цікавяцца іх работай і не дапамагаюць ім ліквідаваць сваю палітычную і агульную няпісьменнасьць.

Тав. ШАГАЛАВА скардзіцца, што яна акуратна зьяўляецца на заняткі, жадае ва што б там ні стала ліквідаваць сваю няпісьменнасьць, але ЗАНЯТКІ ЗРЫВАЮЦЦА ЧАСТА З ЗА НЯЯЎКІ КІРАЎНІКА. Такое ж становішча і ў штопальным цэху.

Пасьля чысткі ўзрасла зацікаўленасьць да палітвучобы ня толькі з боку работніц-партыек, але і БЕСПАРТЫЙНЫХ. Яны акуратна зьяўляюцца на заняткі палітгуртку, але кіраўнік тав. ІОФЭ многа разоў зрываў гэтыя заняткі. Работніцы групы «Л» таксама скардзяцца на тое, што вылучаны кіраўнік гуртка тав. ФОГЕЛЬСОН не цікавіцца даручанай яму працай і зрывае заняткі. Між тым, парткалектыў дагэтуль ня прыняў ніякіх захадаў да гэтых кіраўнікоў, якія зьяўляюцца партыйцамі, не прыцягнула іх да адказнасьці за зрыў работы.

Рад пераведзеных у кандыдаты і спачуваючыя зусім забыты і з боку бюро парткалектыву і бюро цэхавых парт'ячэек. Гэтыя таварышы прадастаўлены самі сабе. З прычыны адсутнасьці ўсякай палітвыхаваўчай работы сярод іх, яны не наведваюць школу і зьнізілі тэмпы выкананьня прамфінпляну.

Тав. ЦАЛ зусім правільна скардзіцца, што з часу пераводу яе з членаў у кандыдаты яна зусім забыта. „Партыйны калектыў ня цікавіцца, як я працую і што раблю". Аб гэтым жа гавораць і астатнія таварышы, пераведзеныя ў кандыдаты і спачуваючыя.

Такія адносіны з боку бюро парткалектыву і бюро цэхавых парт'ячэек да палітвыхаваньня пераведзеных у кандыдаты і спачуваючыя зьяўляюцца прамым ігнараваньнем дырэктыў ЦК партыі аб штодзённай увазе і сыстэматычнай рабоце сярод гэтых таварышоў.

Партыйны калектыў ня ўлічыў ясных указаньняў, якія маюцца ў інструкцыі па чыстцы, што перавод з членаў у кандыдаты партыі і з кандыдатаў—у спачуваючыя не зьяўляецца карай і што гэтыя таварышы, падрыхтаваўшыся, зноў могуць стаць членамі партыі.

Гэта яснае ўказаньне абавязвае партыйнае кіраўніцтва фабрыкі неадкладна ўзяцца за работу сярод кандыдатаў і спачуваючых, ахапіць іх палітвучобай, праводзіць сярод іх гутаркі, уцягваць у грамадзкую працу, дамагаючыся павышэньня іх авангарднай ролі на вытворчасьці.

Вакол кожнага пераведзенага ў кандыдаты і спачуваючыя павінна быць створана таварыская атмасфэра з тым, каб яны адчувалі штодзённыя клопаты аб сабе, сапраўды рыхтаваліся быць членамі партыі.

Я—ч.

## Ячэйка Запсплаўлесу патрабуе сур'ёзнага аздараўленьня

Парт'ячэйка Запсплаўлесу яшчэ да гэтай пары не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі, пастаўленымі пастановамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб становішчы віцебскай партарганізацыі. Як вынік гэтага—у наяўнасьці ганебныя прарывы па выкананьні прамфінпляну.

Заданьне па адгрузцы выканана ўсяго на 50 проц., па разьдзелцы на 39 проц. Прастоі рабочых дасягаюць 48 проц. Маюцца факты, калі мэханічная піла прастойвала па 10 дзён з-за адсутнасьці катушкі і шпагату, якія адміністрацыя не патурбавалася набыць. Ня выкупленыя сваечасова пяць матораў былі прададзены іншым арганізацыям таму, што адміністрацыя праявіла злачынна-нядбайныя адносіны да гэтай справы

Кантора да сёньняшняга дню працуе без усялякага пляну. Конскі транспарт канторы ў колькасьці 50 коняй знаходзіцца ў надзвычайна дрэнным становішчы. 16 коняй выбыла са строю.

На ўсе гэтыя буйнейшыя прарывы і безгаспадарчасьць, якія мяжуюць са шкодніцтвам, ячэйка на чале з сэкратаром АЛЕЙНІКАВЫМ глядзіць скрозь пальцы. Тав. ЗОТАЎ—начальнік сплаўканторы, член партыі, спрабуе замазаць усе гэтыя факты, і, калі 2 жніўня на партсходзе яму ва ўпор было пастаўлена пытаньне аб тым, што ён, як кіраўнік, прыняў для ліквідацыі гэтых прарываў і чаму да гэтай пары ня прыцягнуты да адказнасьці канкрэтныя віноўнікі безгаспадарчасьці, Зотаў абмежаваўся адказам, што аб гэтых фактах... нічога ня ведае.

У ячэйцы моцна зьвіла сабе гняздо сямейнасьць, групаўшчына, адсутнічае ўсялякая крытыка і самакрытыка. Нягледзячы на яскравую пастанову ЦК і гаркому партыі аб перанясеньні партыйнага і гаспадарчага кіраўніцтва на вытворчасьць, непасрэдна ў нізавое зьвяно, ЗОТАЎ І АЛЕЙНІКАЎ працягваюць „кіраваць" з габінэтаў, адарваўшыся ад мас і вытворчасьці, ня ведаючы, што робіцца на вытворчасьці.

З прычыны расхістанасьці партыйнай дысцыпліны, партсходы часта зрываюцца. Напрыклад, партсход, прызначаны на 1 жніўня на складзе ў Чэпіна, быў сарваны, бо ЗОТАЎ І АЛЕЙНІКАЎ САМІ СПАЗЬНІЛІСЯ НА ДЗЬВЕ ГАДЗІНЫ. 2 жніўня партсход быў адчынены замест 2 гадзіны—а 5. І ў гэты раз дакладчык т. ЗОТАЎ І СЭКРАТАР ПАРТ'ЯЧЭЙКІ АЛЕЙНІКАЎ ПРЫЕХАЛІ НА СХОД СА СПАЗЬНЕНЬНЕМ НА ПАЎТАРЫ ГАДЗІНЫ. На гэтым сходзе, дзе прапрацоўваліся (да рэчы з вялікім спазьненьнем) пастановы ЦК КП(б)Б і пленуму гаркому аб становішчы віцебскай партарганізацыі і даклад аб выкананьні прамфінпляну,—зусім ня было крытыкі і самакрытыкі. Прынятае рашэньне па двух дакладах носіць характар агульных разважаньняў і ніводзін з пунктаў да гэтай пары ня выкананы.

Праводзімая зараз чыстка ячэйкі павінна выявіць усе хваробныя зьявішчы ў рабоце ячэйкі і на вытворчасьці, разьбіць сямейнасьць, групаўшчыну, рашуча ўмацаваць партыйную дысцыпліну, выкрыць аліпюшчыкаў, «очковтирателей», бюракратаў, зрыўшчыкаў прамфінпляну і безгаспадарнікаў, ачысьціўшы ад іх парт'ячэйку.

Ячэйка абавязана, не марудзячы ніводнай мінуты, перабудаваць сваю работу такім чынам, каб цэнтр увагі перанесьці на вытворчасьць, у нізавое зьвяно, узьняць авангардную ролю на вытворчасьці кожнага камуніста і тым самым забясьпечыць ліквідацыю маючыхся прарываў у выкананьні прамфінпляну.

Канкрэтныя віноўнікі зрыву прамфінпляну і фактаў безгаспадарчасьці павінны панесьці суровае пакараньне.

ІКС.

Забясьпечым актыўны ўдзел шырокіх мас рабочых і калгасьнікаў у чыстцы і праверцы радоў партыі.

# Аб рабоце груп „лёгкай кавалерыі".

### Пастанова прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і калегіі НК-РСІ СССР і ЦК УсеЛКСМ.

I Работа «лёгкай кавалерыі» на працягу раду год паказала сваю жыцьцёвасьць і вялікае значэньне ў справе ўцягненьня рабочай моладзі ў ажыцьцяўленьне масавага кантролю над выкананьнем дырэктыў партыі і ўраду. Сваёй дзейнасьцю групы „лёгкай кавалерыі" аказалі партыі значную дапамогу ў барацьбе з бюракратызмам і скажэньнямі ў рабоце гаспадарчага, савецкага і каапэрацыйнага апарату.

Разам з тым, ЦКК-РСІ СССР і ЦК УсеЛКСМ лічаць, што за апошні час камсамол, які павінен быў непасрэдна кіраваць «лёгкай кавалерыяй», і мясцовыя органы КК-РСІ не звярталі дастатковай увагі на гэтую работу, не зьмянілі форм і мэтадаў работы „ЛК" у адпаведнасьці з узрослымі задачамі сацбудаўніцтва, калі асабліва патрабуецца праверка выкананьня кожнай дырэктывы партыі і ўраду, уменьне давесьці кожную пачатую справу да канца.

У рэзультаце, у рабоце «ЛК» маецца рад буйных недахопаў: слабая масавасьць, у некаторых групах „ЛК" няправільныя мэтады работы, захапленьне павярхоўнымі рэйдамі, налётамі, няма выхаваўчай работы, з «кавалерыстамі». Работа «ЛК» у друку, асабліва камсамольскім, асьвятлялася вельмі слаба.

У асаблівасьці кепска разгорнута работа „ЛК" на вёсцы, дзе нягледзячы на асабліва важнае значэньне кантролю за выкананьнем дырэктыў партыі па сельскай гаспадарцы, перадавая калгасная моладзь ня ўцягнута ў работу «ЛК» і групы «ЛК» нявялікія і неактыўныя.

Побач з гэтым там. дзе камітэты камсамолу і органы КК-РСІ ўдзялялі ўвагу і аказвалі дапамогу ў рабоце „ЛК" праведзены рад істотных, самастойных і сумесных з РСІ масавых праверак па крамах, сталоўках у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і інш., у працэсе якіх зьнішчаліся выяўленыя недахопы і павялічвалася колькасьць груп „ЛК" і іх удзельнікаў (Масква, Ленінград, Беларусь).

II Прэзыдыум ЦКК УсеКП(б), калегія НК РСІ і ЦК УсеЛКСМ лічаць неабходным для таго, каб зрабіць «ЛК» сапраўды баявым і масавым рухам рабочай і калгаснай моладзі, адной з форм навучаньня справе кіраваньня дзяржавай,—згуртаваць яе дзейнасьць на сыстэматычнай праверцы выкананьня дырэктыў партыі і ўраду, арганізацыі паўсядзённай барацьбы з бюракратызмам, паляпшэньні работы ўсіх зьвеньняў апарату кіраўніцтва, калгасаў і ахове сац. маёмасьці.

У бліжэйшы час КК РСІ разам з камсамолам і з прыцягненьнем «ЛК» правесьці масавыя праверкі па пытаньнях:

а) у галіне снабжэньня і культбытавога абслугоўваньня—праверка работы крам, сталовак, прыгарадных гаспадарак, барацьба з раскрадваньнямі, сваечасовае праведзеньне ўборкі, загатоўкі і захаваньне гародніны, лепшая пастаноўка работы бытавых установ, інтэрнатаў, больніц, ясьляў;

б) у галіне вытворчасьці—рэалізацыя рабочых прапаноў, умацненьне працоўнай дысцыпліны, паляпшаньне якасьці прадукцыі, беражлівых адносін да абсталяваньня, удзел у рабочым шэфстве і сацыялістычным будаўніцтве;

в) у галіне транспарту—ахова таварных грузаў, праверка культбытавога абслугоўваньня пасажыраў, абсьледваньне санітарнага становішча вагонаў і вагзалаў, гатоўнасьці да перавозак збожжа і гародніны, расьсьледваньне і ўнікненьне прычын невыкананьня плянаў перавозак, недагрузаў, прастояў і г. д;

г) у галіне сельскай гаспадаркі—ахова ўраджаю калгаснай і саўгаснай маёмасьці, барацьба са стратамі, сваечасовае выкананьне пляну сельгасработ і збожжаздачы дзяржаве.

Для выкананьня гэтых задач прапанаваць камітэтам камсамолу, якія непасрэдна нясуць адказнасьць за становішча работы «ЛК», арганізаваць групы „ЛК" у кожнай ячэйцы камсамолу і палепшыць штодзённае кіраўніцтва іх работай, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на разгортваньне гэтай работы на вёсцы, сыстэматычна заслухоўваць даклады па рабоце „ЛК" у камітэтах камсамолу, практыкаваць пастаноўку справаздач «ЛК» на сходах рабочых, калгасьнікаў, камсамолу і моладзі, асьвятляючы ў друку рэзультаты праведзеных работ, выхоўваючы «кавалерыстаў» на канкрэтных прыкладах работы, сыстэматычна інструктаваць групы „ЛК", склікаючы нарады важакоў групы па асобных галінах работы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на ўзмацненьне кадраў кіраўнікоў груп „ЛК" за лік лепшых правераных камсамольцаў.

Прапанаваць органам КК-РСІ ўзмацніць дапамогу ў рабоце груп „лёгкай кавалерыі", дабіваючыся сыстэматычнага ўдзелу камсамолу ў пляновых абсьледваньнях РСІ, даючы пэрыядычныя заданьні непасрэдна групам „ЛК", дабіваючыся давядзеньня кожнай пачатай справы да канца і абгаварэньня рэзультатаў іх работы ў органах РСІ і камсамолу, уцягваючы і правільна скарыстоўваючы пры гэтым камсамольцаў і рабочую моладзь з груп „ЛК" у якасьці актыву і па-зашатных інспэктароў РСІ.

Неадкладна рэалізаваць рашэньне прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) ад 14 красавіка г. г. аб умацаваньні складу прадстаўнікоў камсамолу ў органах РСІ для работы іх па лініі „лёгкай кавалерыі" і арганізацыі сумеснай работы камсамолу і РСІ.

Даручыць аргінструктарскім аддзелам ЦКК РСІ і ЦК УсеЛКСМ праз шэсьць месяцаў праверыць выкананьне гэтае пастановы па Уральскай і Кіеўскай воблясьцях.

## Да суровай адказнасьці зрыўшчыкаў рабочага снабжэньня.

(Ліст служачага).

Па віне намесьніка дырэктара півзавода Скутэльскага Ф., згніло некальні бочак гуркоў, якія і былі 6 жніўня выкінуты ў раку Дзьвіну. Гуркі, ня будучы сваечасова перабранымі, не маглі пайсьці на харчаваньне рабочых. Цікава тое, што з мая месяцу ў сталоўцы да абедаў рабочым не давалі гуркоў зусім.

Нас цікавіць—чаму і на што гуркі трымаліся да жніўня месяцу. Ці ня ёсьць гэта яскравы факт наўмыснага зрыву снабжэньня рабочых.

Л. ТАНХЭЛЬСОН.

АД РЭДАКЦЫІ. Мы лічым гэты факт абураючым. Спадзяемся, што гарКК-РСІ займецца гэтай справай і прыме канкрэтныя меры па сутнасьці ліста.

## АРЦЕЛЬ „КААПРАМОНТ" ЗЛАЧЫННА НЯ ВЫКОНВАЕ ЗАКАЗАЎ НА ПАШЫЎКУ АБУТКУ.

Сацбытавым сэктарам гарпрафсавету за май і чэрвень месяцы былі разьмеркаваны сярод рабочых звыш тысячы ордэраў на індывідуальную пашыўку абутку. З гэтай колькасьці па 233 ордэрах пашыўка мужчынскага абутку засталася нявыкананай.

Нягледзячы на пастанову РСІ ад 24 чэрвеня аб тым, каб арцель „Каапрамонт" у тэрміновым парадку выканала заказы па ўсіх выдадзеных ордэрах,—рабочыя да гэтага часу штодзённа абіваюць парогі магазыну № 7 Белкаапсаюзу, дзе знаходзіцца прыёмачны пункт індывідуальных заказаў, без усякага толку.

Адпаведным арганізацыям трэба ўмяшацца ў гэтую справу, каб спыніць такія агіднасьці.

ЧЫЖЫКАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ.

Рэдакцыя лічыць зусім недапушчальным, калі рабочыя, у тым ліку лепшыя ўдарнікі, якія да майскіх сьвят атрымалі ордэры на індывідуальную пашыўку абутку, унёсшы авансам 50 проц. каштоўнасьці заказа, два месяцы дарэмна абіваюць парогі прыёмачнага пункту.

Нявыкананыя заказы па 233 ордэрах лічыцца за арцельлю „Каапрамонт".

Здарылася гэта таму, што былы старшыня арцелі „Каапрамонт" ФАЛКОЎ не забясьпечыў сваечасова арцель неабходным скураным таварам і замест таго, каб паехаць у Менск за таварам—паехаў ў адпачынак. Яго намесьнік т. Высоцкі таксама ня прымаў мер, каб дабыць патрэбную сыравіну.

У гутарцы з работнікам рэдакцыі, дырэктар абутковай фабрыкі „Прагрэс" т. ПАЛЬМАН заявіў, што на фабрыцы маецца неабходны верхні і ніжні тавар для пашыўкі абутку і калі яму будуць перададзены нарады, то ён гэтыя заказы хутка выканае.

Неабходна, каб гарпрафсавет тэрмінова ўмяшаўся ў гэтую справу.

За ігнараваньне пастановы РСІ аб выкананьні заказаў па выданых ордэрах, за бюракратычную цяганіну, былы старшыня арцелі „Каапрамонт" і яго намесьнік ВЫСОЦКІ павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

П. ЮДЗІН.

# У ЧЫМ СУТНАСЬЦЬ БАРАЦЬБЫ ПАРТЫІ НА ДВА ФРАНТЫ *).

Праанал ізаваўшы гісторыю партыі з пункту гледжаньня асноўнага закону матар'ялістычнай дыялектыкі, закона барацьбы і перамаганьня супярэчнасьцяй, т. СТАЛІН на аснове ўсебаковага вывучэньня багатай барацьбой гісторыі нашай партыі, фармулюе, як ЗАКОН ЯЕ РАЗЬВІЦЬЦЯ, як крыніца яе пасоўваньня наперад і як умова яе ўзросту і перамогі барацьбу і перамаганьне супярэчнасьцяй, узьнікаючых унутры партыі ў ходзе яе рэвалюцыйнай барацьбы. «Выходзіць, што УсеКП(б) расла і ўмацоўвалася праз перамаганьне ўнутрыпартыйных супярэчнасьцяй Выходзіць, што перамаганьне ўнутрыпартыйных рознагалосьсяў шляхам барацьбы зьяўляецца законам разьвіцьця нашай партыі... Гэты закон зьяўляецца законам разьвіцьця для ўсіх колькі небудзь вялікіх партый, усё роўна ці мова ідзе аб пралетарскай партыі СССР, ці аб партыях на Захадзе». («Об оппозиции», стар. 44 ).

Марксызм ленінізм вучыць, што адзіны шлях зжываньня супярэчнасьцяй—перамаганьне іх праз бязьлітасную барацьбу, праз перамогу таго, ці іншага боку супярэчнасьці. „Калі пытаньне гэтае зьвязана з прынцыповымі рознагалосьсямі, то ніякая згода, ніякая «сярэдняя» лінія ня можа ратаваць справы Няма і ня можа быць „сярэдняй" лініі ў пытаньнях прынцыповага характару. Альбо адны, альбо другія прынцыпы павінны быць пакладзены ў аснову работы партыі" («Об оппозиции», стар. 439).

Супярэчнасьці ў гісторыі партыі ня ёсьць вынікам выпадковасьці, ня ёсьць вынік волі паасобных людзей, а параджаецца ўсім аб'ектыўным ходам гісторыі, параджаецца супярэчлівасьцю самой гістарычнай сапраўднасьці, у якой пралетарыят змагаецца. «Ці можна ўцячы ад гэтых супярэчнасьцяй і рознагалосьсяў? Не, ня можна. Думаць, што можна ўцячы ад гэтых супярэчнасьцяй, гэта значыць абманваць сабе, Энгельс быў праў, калі ён казаў, што замазваць супярэчнасьці ўнутры партыі надоўга немагчыма, што гэтыя супярэчнасьці вырашаюцца барацьбой» („Об оппозиции", стар. 445).

Рабочая кляса не адгароджана непраходзімай сьцяной ад усіх другіх кляс. Буржуазная ідэалёгія ўплывае на менш устойлівыя пласты пралетарыяту, праз гэтыя пласты буржуазная ідэалёгія пранікае ў вядомай меры, у залежнасьці ад канкрэтных гістарычных умоў, у рады пралетарскай партыі. Гэты ўплыў буржуазнай ідэалёгіі на некаторыя рады пралетарыяту, «так ці іначай зьвязаныя з буржуазным грамадзтвам», праяўляецца ў форме буржуазных ідэй, звычаяў і г. д., якім бывае падвержана гэта частка пралетарыяту, праз якую яны перадаюцца менш устойлівай частцы членаў партыі. Такім чынам, адной з прычын, якія параджаюць супярэчнасьці ўнутры партыі зьяўляецца непасрэдны ўплыў на частку яе членаў буржуазнай ідэалёгіі.

Далей, самая рабочая кляса неаднародна. Яна праходзіць працяглую гісторыю свайго фарміраваньня. заўсёды папаўняючыся з розных разараючыхся ва ўмовах капіталізма грамадзкіх пластоў і галоўным чынам з сялянства. Тав. Сталін устанаўлівае тры асноўныя праслойкі ў рабочай клясе: 1) Асноўная маса пралетарыяту, якая даўно парвала са сваім мінулым, свой лёс моцна зьвязала з фабрыкай, заводам, прайшла ўжо вядомую школу клясавай барацьбы з капіталізмам, гэта так званая частка „чыстакроўных" пралетараў. «Гэты пласт пралетарыяту зьяўляецца найбольш надзейнай апорай марксызму» («Об оппозиции», стар. 444).

2) Найбольш маладая частка рабочай клясы (ня ў сэнсе ўзросту, а часу прыходу на фабрыку, завод), якая яшчэ нядаўна парвала, ці яшчэ не парвала канчаткова сваіх сувязей з мінулым асяродзьдзем (галоўным чынам з сялянствам), якая прыносіць з сабою ў рады пралетарыяту погляды, звычкі і навыкі таго асяродзішча, адкуль яна выйшла (сялянства, мяшчанства, інтэлігенцыя). „Гэты пласт прадстаўляе найбольш падатную глебу для ўсякіх анархісцкіх, паўанархісцкіх і „ультра-левых" груповак" („Об оппозиции", стар. 444). 3. Пры капіталістычнай сыстэме разьдзяленьня працы з асяродку найбольш высокааплачваемых рабочых вылучаецца вядомая праслойка рабочай арыстакратыі, якая па сваёй ролі ў вытворчасьці і па сваім матар'яльным становішчы бліжэй за ўсё стаіць да камандных колаў капіталістычнага прадпрыемства. На Захадзе ва ўмовах буржуазнай дэмакратыі вырастае цэлая армія прафсаюзных і партыйных сацыял-дэмакратычных чыноўнікаў, якія свае пасады ператвараюць у «цёплыя» мясьцінкі, зрастаючыся паралку з дзяржаўнымі чыноўнікамі, цалкам адрываючыся ад мас, ствараючы асноўны касьцяк сацыял-дэмакратычных функцыянэраў. Капіталісты часьцей усяго ў гэтым асяродзішчы знаходзяць сваіх абаронцаў сярод рабочых. Гэта частка рабочых і прафсаюзных чыноўнікаў імкнецца «выйсьці ў людзі», ДАПАСАВАЦЦА ДА пануючых клясаў. «Гэты пласт прадстаўляе найбольш падатную глебу для адкрытых рэфармістаў і апартуністаў». („Об оппозиции", страница 444)

Два апошніх пласты рабочых, разам узятыя, прадстаўляюць сабой базу апартунізма ў рабочай класе, першая частка пераважна пітае „левыя" анархісцкія настроі, другая частка—адкрыта правыя рэфармісцкія настроі і погляды. „Нягледзячы на знадворную розьніцу, гэтыя два апошнія пласты рабочай клясы прадстаўляюць больш ці менш агульны асяродак, які пітаецца апартунізмам наогул". („Об оппозиции", стар. 444).

У гэтай агульнасьці двух пластоў і крыецца тое, што правы апартунізм ёсьць правая абаротная старана „левага", як і „левы" апартунізм ёсьць ізнанка апартунізма правага. Апартунізм ва розных гістарычных этапах выступае з рознай канкрэтнай праграмай і ў рознай форме, але яго клясавая сутнасьць, яго антыпралетарскі характар застаюцца на ўсіх этапах.

"Натуральна, што пры кожным павароце ў разьвіцьці клясавай барацьбы, пры кожным абвастрэньні барацьбы і павялічэньні цяжкасьцяй розьніца ў поглядах, у навыках і ў настроях розных пластоў пралетарыяту павінна нямінуча сказацца ў выглядзе вядомых рознагалосьсяў у партыі, а даўленьне буржуазіі і яе ідэалёгіі нямінуча павінны абвастрыць гэтыя разнагалосьсі, даўшы ім выхад у выглядзе барацьбы унутры пралетарскай партыі" („Об оппозиции, стар. 445).

* * *

НАША ПАРТЫЯ НЯЎХІЛЬНА ПРАЦЯГВАЕ І Ў ЦЯПЕРАШНІ ЧАС ВЕСЬЦІ БАРАЦЬБУ НА ДВА ФРАНТЫ.

ПРАВЫ, АДКРЫВЕННЫ КАПІТУЛЯНЦКІ АПАРТУНІЗМ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ, так як ён выражае адчайнае супраціўленьне сацыялізму апошняй капіталістычнай клясы—кулацтва, ліквідуемага і ў асноўным ужо ліквідаванага як кляса. ПРАВЫ АПАРТУНІЗМ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА Ў БАРАЦЬБЕ СУПРОЦЬ ТЭМПАЎ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ, У ПРОПАВЕДЗІ „НЕРЭАЛЬНАСЬЦІ" НАШЫХ ПЛЯНАЎ, У ЗРЫВЕ РАБОТЫ КАЛГАСАЎ І САЎГАСАЎ, У ПАПУСЬЦІЦЕЛЬСТВЕ КУЛАЦКІМ ЭЛЕМЭНТАМ У КАЛГАСАХ, У СУПРАЦІЎЛЕНЬНІ ВЫКАНАНЬНЮ ПАСЕЎНЫХ ПЛЯНАЎ, ПЛЯНАЎ УБОРКІ ЎРАДЖАЮ І ЗДАЧЫ ХЛЕБА ДЗЯРЖАВЕ ЯК ПЕРШАЧАРГОВАГА АБАВЯЗКУ КОЖНАГА САЎГАСА, КАЛГАСА І АДНААСОБНІКА.

ПРАВЫ АПАРТУНІЗМ ПРЫМАЕ ФОРМУ БУРЖУАЗНАГА СКАЖЭНЬНЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ І ЗРЫВА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЛЯНА; УКРЫЦЬЦЁ РЭСУРСАЎ ад дзяржавы; абман дзяржавы з-за рознага роду „мясьнічаскіх" меркаваньняў; укрыцьцё сапраўднай магутнасьці вытворчасьці, наяўнасьці тавараў, сыравіны, будматар'ялаў і інш.; спробу урваць ад дзяржавы шляхам абману найбольш, а даць дзяржаве паменш.

ПРАВЫЯ АПАРТУНІСТЫ АДМАЎЛЯЮЦЬ, «НЯ БАЧАЦЬ» КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ Ў КРАІНЕ ня бачаць яе ў вёсцы. Правыя і „левыя" апартуністы аказваюць супраціўленьне пляну партыі на ўмацаваньне работы ў вёсцы праз палітаддзелы.

„ЛЕВЫ" АПАРТУНІЗМ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ ВЫСТУПАЕ З ПРАПАВЕДЗЬДЗЮ, ШТО ЎЖО ЦЯПЕР ДЗЯРЖАВА АДМІРАЕ, а ў другой пяцігодцы разам са зьнішчэньнем клясаў яна адамрэ зусім. Пагэтаму цяпер ужо ў раёнах суцэльнай калектывізацыі, па іх думцы, саветы трэба скасаваць, а ўсю ўладу перадаць праўленьню калгаса.

«Левыя» скажаюць вучэньне Маркса-Леніна-Сталіна аб тым, што да зьнішчэньня клясаў мы прыдзем толькі шляхам умацаваньня пралетарскай дыктатуры, што пралетарская дыктатура пачне адміраць толькі пасьля зьнішчэньня клясаў, у разгорнутым сацыялістычным грамадзтве і канчаткова адамрэ пры поўным камунізьме.

„Левакі" гатовы пераскачыць праз усе этапы змычкі горада і вёскі і зьнішчыць савецкі гандаль, грошы, прапаведуючы прамы прадуктаабмен.

У адносінах да калгасаў і калгасьнікаў „левакі" прымяняюць мэтады голага адміністрацыйнага камандваньня. „Левакі" пры пасьлядоўным праведзеньні іх поглядаў няўхільна прыходзяць да погляду контррэвалюцыйнага трацкізму.

ПРАВЫЯ І „ЛЕВЫЯ" АТАКУЮЦЬ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ З ПАЗЫЦЫЙ БУРЖУАЗНАЙ РЭСТАЎРАЦЫІ, АЛЕ ВЫСТУПАЮЦЬ З РОЗНЫМІ ЛЁЗУНГАМІ, ПАД РОЗНЫМІ ШТАНДАРАМІ.

Партыя вядзе рашучую барацьбу з усякімі праявамі правага і „левага" апартунізму і з прымірэнцамі да іх, як правіла выступаючымі зараз у скрытай форме. Двурушніцтва—адна з улюбёных цяпер форм барацьбы ўсіх апартуністаў і прымірэнцаў з генэральнай лініяй партыі

Партыйная чыстка, ачышчаючы рады партыі ад апартуністаў усіх відаў, прымірэнцаў і двурушнікаў, ад парушыцеляў жалезнай дысцыпліны партыі і дзяржавы, яшчэ больш згуртуе рады бальшавікоў, яшчэ цясьней вакол ленінскай партыі і самкне мільённыя масы пралетараў і калгасьнікаў.

Партыйная чыстка яшчэ вышэй узьніме палітычную пільнасьць кожнага камуніста, яшчэ больш высокім стане ідэёвы палітычны ўзровень партыі. Партыя у рэзультаце чысткі будзе яшчэ больш падрыхтаванай на штурм усіх цяжкасьцяй як па лініі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, так і ў барацьбе за міжнародную пралетарскую рэвалюцыю.

*) Канец. Пачатак гл. у № 186 «Віцебскага пралетара».

*„Першая заповедзь—выкананьне збожжазагатовак“. (Сталін).*

# „Цэнтральнай задачай уборачнай кампаніі гэтага году зьяўляецца арганізацыя хутчэйшага абмалоту“.

*(З пастановы ЦК КП(б)Б і СНК СССР).*

## 10 проц. збожжа засталося ў саломе пасьля абмалоту.

*Сыгнал з Маталыжанскай брыгады калгаса імя Молатава заслугоўвае выключнай увагі і павінен быць безадкладна ўлічаны кожным калгасам, кожнай ячэйкай і сельсаветам, кожным упаўнаважаным гаркому партыі і гарсавету. Нам не патрэбна славесна-дэклярацыйнае «змаганьне» за якасьць уборкі. Нам патрэбны справы, нам патрэбна самая высокая якасьць кожнага працэсу ўборкі. Дзяржава і калгасьнікі павінны атрымаць збожжа самай высокай якасьці. Жалезны адпор малейшым спробам кулацкіх агентаў зьменшыць ураджай!*

2 жніўня раніцой у МАТАЛЫЖАНСКАЙ БРЫГАДЗЕ КАЛГАСА імя МОЛАТАВА, БАБІНІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, возчык СІДАРЭНКА ПАЎЛА пачаў вазіць у ёўню мокрае жыта (бо яно раней ляжала ў раскрытых бабках).

Вартаўнік ПАЛУДЗЕШЫН ІВАН першы раз вытапіў ёўню ольхай, каб не папсаваць зярнё. На другія суткі ёўня была натоплена больш моцна. Жыта ў ёўні вартаваў ПАЛУДЗЕШЫН, каб яго не пакралі і не здарылася пажару.

4 жніўня в 5 гадзіны раніцы СІДАРЭНКА ПАЎЛА, вылучаны сталым машыністам—і яшчэ адзін калгасьнік, 6 калгасьніц жанчын прышлі малаціць. Але пакуль прывялі коняй, прайшла цэлая гадзіна. Малацьба пачалася толькі а 6 гадзіне. З пачатку малацьбы прысутнічаў брыгадзір гарсавету тав. Голубаў, але, пастаяўшы нявалькі мінут, ён раптам пашоў.

Малацьба 4-х коп (240 снапоў) была скончана ў 9 гадзін раніцы. Потым СІДАРЭНКА ПАЎЛА і ПРУСАЎ ПАЎЛА пачалі веяць, а брыгадзір РАДЗЕВІЧ ІВАН вызначыў падводу для адвозкі жыта.

Трэба сказаць, што жыта, якое два разы веялі, усё ж аказалася вільготным. Веяньне праводзілася амаль да 2 гадзін дню.

Прыехаўшы ў пачатку 3 гадзіны з мяхамі возчык БАЛАХОНАЎ разам з машыністам СІДАРЭНКАЙ і брыгадзірам Радзевічам насыпалі ў тры мяхі 11 пудоў 11 фунтаў намалочанага жыта. Узважваньне было вытварана на старых вагах (неправераных).

Гэтае жыта павезьлі здаваць дзяржаве ў лік збожжапаставак.

ХАРАКТЭРНА АДЗНАЧЫЦЬ, ШТО Ў САЛОМЕ ПАСЬЛЯ АБМАЛОТУ ЗАСТАЛОСЯ 10 ПРОЦ. ЗБОЖЖА, А БРЫГАДЗІР РАДЗЕВІЧ ІВАН ЗАПЭЎНІВАЎ, ШТО СТРАТ МАЛА, „ПЕРАМАЛВАЦЬ“ САЛОМУ НЯМА РАХУНКУ І ГЭТА ЯНЫ РАБІЦЬ НЯ БУДУЦЬ.

Як мы потым даведаліся, жыта з-за павышанага проценту вільгаці зусім правільна ня было прынята пунктам Загатзбожжа.

Вось гэты першы ўрок таго, як ня трэба малаціць, павінен улічыць ня толькі калгас імя Молатава, але кожны калгас нашага раёну.

Трэба адзначыць, што такая няўдача першага абмалоту тлумачыцца выключна тым, што праўленьне калгаса не арганізавала малацьбы, што праўленьне калгаса не забясьпечыла ўсіх неабходных умоў для пасьпяховага яе правядзеньня.

У гэты-ж час трэба са ўсёй яскравасьцю сказаць, што ў дадзым выпадку, бясспрэчна, мы маем, з другога боку, праяўленьне непатрэбнай азартнай сьпешкі, «лявацкага» «рэкордсмэнства», якое выявілася ў абмалоце зусім вільготнага жыта.

Гэта, бясспрэчна, вынік падпаданьня пад уплыў класавага ворага, справа, накіраваная на зрыў дзяржаўных збожжапаставак, спроба кулацкай агентуры ашукаць дзяржаву.

З гэтага першага ўроку трэба зрабіць яшчэ адзін вывад, а менавіта: неабходна, каб накіраваныя ў вёску брыгадзіры былі ўвесь час пры малацьбе, а ня так як т. Голубеў, які зірнуў і адразу-ж «змыўся».

За арганізацыяй малацьбы і яе якасьцю трэба наладзіць самы строгі, баявы кантроль усёй масы калгасьнікаў ударнікаў.

Р.

## ЗАРАЗ-ЖА ЎЛІЧЫЦЬ УРОК МАЛАЦЬБЫ НА СКЛАДАНАЙ МАЛАТАРНІ.

Малацьба ў калгасе „Бяроза“, Вяліка-Лётчанскага сельсавету, ідзе вельмі маруднымі тэмпамі. Сваёй нераспараджальнасьцю старшыня калгаса Юрчанка зрывае малацьбу, а разам з ёй і першачарговую датэрміновую здачу дзяржаве высокаякаснага збожжа.

У калгасе маецца складаная малатарня МТС маркі МК № 1110, але-ж скарыстаньне яе з рук вон дрэннае. Загадчык вытворчага вучастку МТС Аверка яшчэ 8 жніўня аддаў распараджэньне, каб да 9 гадз. раніцы 9 жніўня навазіць снапоў і забясьпечыць малацьбу хлеба на гэтай малатарні. Але-ж снапы былі навезены ў той толькі да 5 гадзін увечары і то ў недастатковай колькасьці, іх хапіла для гэтай малатарні толькі на 2 гадзіны.

Увесь хлеб, які маецца ў калгасе „Бяроза“, пры спраўнасьці складанай малатарні магчыма змалаціць за 2 дні.

Малатарня была пушчана ў ход неправеранай. Калі а 6 гадзіне ўвечары пачалі малацьбу, то праз 15 мінут яна застанавілася: ня добра былі пастаўлены сіты. Машыністы Шкэпіст і Шалкоў не дагледзілі за гэтым, нагледзячы на тое, што малатарня стаяла цэлы дзень. У другі раз абарваўся болт ад падшыпніка і, такім чынам, пры 2 гадзінах работы малатарня стаяла на рамонце 1 гадзіну. У працэсе самой работы ня было правільнай расстаноўкі рабочых сіл, людзі мітусіліся. Прыбыўшы аграном УГОРЫЦ, расставіўшы правільна рабочую сілу, асабліва ва ўборцы саломы, зьнішчыў гэты недахоп.

Праўленьне калгаса павінна ўлічыць урок першага абмалоту на складанай машыне—малатарні і забясьпечыць хутчэйшы абмалот і здачу дзяржаве збожжа.

Р. ВАСІЛЬЕЎ.

**11 ЖНІЎНЯ. ДЗЁНЬНІК РАБОТЫ СКЛАДАНАЙ МАЛАТАРНІ—МК 1100.**

(Калгас «Бяроза», Вяліка-Лётчанскага сельсавету).

*✱ Малатарня пачала работу з 12 гадзін дню. Дзяжурныя машыністы тт. Шкэпіст і Шалкоў. Малатарня работала з вялікімі перабоямі, галоўным чынам, з-за дрэнна арганізаванай падвозкі снапоў. У машыны дзяжурыў прымацаваны брыгадзір гаркому партыі т. Тэф. Работа працягвалася да 10-ці гадзін увечары замест таго, каб малатарня працавала 20 гадзін у суткі.*

*Намалочана 2084 кілёграм жыта. Замест нормы за 10 гадзін—8000 кілёграм. Якасьць абмалоту здавальняючая.*

*✱ Брыгадзір брыгады № 3 калгаса „Бяроза“ Восіпаў вядзе сярод калгасьнікаў, працуючых ля малатарні, шкодныя, кулацкія размовы аб непатрэбнасьці першачарговай здачы збожжа дзяржаве.*

*Гэтыя кулацкія размовы ня сустрэлі руйнуючага адпору.*

## У БАБІНІЧАХ НЕ АРГАНІЗАВАНА МАЛАЦЬБА Ў АДНААСОБНІКАЎ.

Старшыня БАБІНІЦКАГА сельсавету ЯНУШЭВІЧ і сакратар парт'ячэйкі МІХАЙЛАЎ арганізацыяй уборкі, малацьбы і здачы збожжа дзяржаве ў аднаасобным сэктары не займаюцца. У сельсавеце ніхто дасканала ня ведае хто з аднаасобнікаў і колькі зжаў.

Члены сельсавету вёскі Копчань КУЛАКОЎ ДЗЬМІТРЫ, вёскі Гаралёва МІХАЛЬЧАНКА ІВАН у сваіх пунктах не арганізавалі пунктаў абмалоту, яны нават ня ведаюць: колькі трэба жаць, што зжата аднаасобнікамі іх вучасткаў. Член сельсавету Кулакоў па „лявацку“ заяўляе: „ХАЙ ЯК ХОЧУЦЬ МАЛОЦЯЦЬ І СУШАЦЬ, МНЕ ДА ГЭТАГА СПРАВЫ НЯМА“.

У вёсцы Бабінічы цьвёрдазаданьніца Сьмірнова Сьцепаніда яшчэ не прыступіла да жніва нават зусім пасьпеўшага жыта, а член сельсавету Серабракоў на гэты кулацкі сабатаж уборкі гледзіць спакойна—гэта яго ня турбуе.

Трэба, нарэшце, пакончыць з „лявацкім“ ігнараваньнем аднаасобніка ў Бабініцкім сельсавеце.

Б.

ДОБРАЕ ЗБОЖЖА НОВАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ЎРАДЖАЮ.

## АБМАЛОЧВАЦЬ ТОЛЬКІ СУХОЕ ЗБОЖЖА!

Бязьлітасная барацьба раскрадальнікам!

Дрэнна арганізавана малацьба Ў КАЛГАСЕ ІМЯ 1 МАЯ, БАБІНІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ.

Да малатарні ў брыгадзе № 1 падвозіцца непрасушанае жыта. Па брыгадзе № 2 нават яшчэ не ўстаноўлена малатарня.

Пры малацьбе няма сталай вытворчай брыгады, не арганізавана ахова збожжа ля малатарні. Брыгадзір Ісьпенка цягае прыгоршнямі з току намалочанае жыта, а матка яго Аляксандра тут жа паганяе коняй і наўмысьля ня хоча бачыць гэтага.

Абмалочанае жыта 5 жніўня раніцой веялі, яно аказалася вільготным.

У брыгадзе № 2 (брыгадзір Міхальчанка) да малацьбы не падрыхтаваліся.

Праўленьне калгаса і кладаўшчык Піскуноў Базыль ня прымаюць ніякіх мер для падрыхтоўкі збожжахавальняў. Сьвірны не ачышчаны, не продэзынфэкцыяваны. Старыя пудавыя вагі маюцца ў калгасе, але і яны ня спраўны.

Трэба МТС зараз-жа прыняць самыя рашучыя меры для таго, каб пакласьці канец разгільдзяйству, неарганізаванасьці, якая мае месца ў калгасе імя 1 мая, з тым, каб забясьпечыць на справе пасьпяховае правядзеньне абмалоту, першачарговай, датэрміновай здачы высокаякаснага збожжа дзяржаве, правільнага авансаваньня калгасьнікаў, засыпкі насенных фондаў, разьмеркаваньня ўраджаю па працадзёнях, пасьля выкананьня абавязацельстваў перад дзяржаваю.

А.

## Аб пляне зяблівага ворыва на 1933 год.

12 жніўня г. г. за подпісамі тт. В. МОЛАТАВА і І. МІРОШНІКАВА апублікавана пастанова СНК СССР аб пляне зяблівага ворыва на 1933 год. Плян зяблівага ворыва на 1933 год зацьверджаны ў разьмеры 36,5 млн. га, з іх у саўгасах 6 557,2 га, у калгасах—27.266,5 тыс. га (у тым ліку ў калгасах, якія абслугоўваюцца МТС —17.847 тыс. га) і аднаасобных гаспадарках 2.676,3 тыс. га.

Для БССР зацьверджаны плян зяблівага ворыва па ўсіх сэктарох у разьмеры 952 тыс. га, у тым ліку для калгасаў 550 (з іх для калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС,—300), для саўгасаў—102, з іх для саўгасаў Наркамсаўгасаў—69, Наркамзему—22,4, Наркамснабу—0,8, Цэнтрасаюзу—6,6 і іншых саўгасаў—3,2 і для аднаасобных гаспадарак 300 тыс.

Саўнаркомам саюзных і аўтаномных рэспублік, краявым і абласным выканкомам прапанавана забясьпечыць давядзеньне не пазьней 1 верасьня 1933 году плянаў і тэрмінаў зяблівага ворыва да кожнага раёну, машына-трактарных станцый, калгасаў і саўгасаў мясцовага значэньня. Наркамсаўгасаў, Наркамснабу і Наркамзему СССР прапанавана ўстанавіць пляны зяблівага ворыва па кожным саўгасным трэсьце агульнасаюзнага значэньня і забясьпечыць давядзеньне трэстамі плянаў зяблівага ворыва да кожнага саўгаса не пазьней 25 жніўня 1933 г.

У пляне работы саўгасаў, МТС і калгасаў прапанавана прадугледзіць ворыва пад зябліва ў першую чаргу для асноўных культур. Раённым зямельным органам, дырэктаром МТС і саўгасаў і праўленьням калгасаў прапануецца арганізаваць дакладны кантроль за якасьцю зяблівага ворыва. Забараняецца залічваць у рахунак выкананьне ўстаноўленага плянам зяблівага ворыва лушчоўку жніўя, пакінуты для яравой сяўбы папар, а таксама прабаранаваныя, але неўзараныя плошчы з-пад прапашных культур.

## АБ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАДУКЦЫІ КААПГАСАЎ БССР.

### З пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ і БКС.

Бальшавіцкае правядзеньне ўборачнай кампаніі ў каапгасах і правільная рэалізацыя прадукцыі зьяўляюцца асноўным, заключным зьвяном ўсёй гаспадарчых работ гэтага году па стварэньні харчовай базы рабочага снабжэньня. Ад прафсаюзных, гаспадарчых і каапэрацыйных арганізацый патрабуецца максымальнае праяўленьне ўвагі, энэргіі і арганізатарскай здольнасьці ў справе арганізацыі рабочых мас, выкарыстаньня ўсіх тэхнічных сродкаў, цяглавай сілы і інш. на пасьпяховае правядзеньне ўборкі ў каапгасах.

1. Выходзячы з фактычнай плошчы пасеву асноўных культур гародніны—2.266 га, бульбы раньняй—528 га, бульбы позьняй—3.500 га, яравых (авёс—ячмень)—9.952 га, жыта і пшаніцы—2.415 га і выяўленага фактычнага становішча ўраджайнасьці: па гародніне—15 тон, бульбе раньняй—7 тон, бульбе позьняй—12 тон, яравых—1 тона, жыта—1 тона з га,—устанавіць наступныя прынцыпы рэалізацыі прадукцыі:

ПА ГАРОДНІНЕ:

З валавога збору ў 33.982,5 тоны пакінуць на насеньне 1.065 тон, а 32.917,5 тон лічыць таварнай прадукцыяй.

ПА БУЛЬБЕ РАНЬНЯЙ:

З валавога збору ў 3.696 тон пакінуць на насеньне 1.500 тон, а 2.196 тон лічыць таварнай прадукцыяй.

ПА БУЛЬБЕ ПОЗЬНЯЙ:

З валавога збору ў 42.000 тон пакінуць на насеньне 6.750 тон, на корм жывёлы—8.930 тон, з якіх на кармленьне сьвіней—8.340 тон, буйнай рагатай жывёлы—590 тон, страхфонд—675 тон і 25.645 тон лічыць таварнай прадукцыяй для рэалізацыі сярод рабочых (індывідуальнае снабжэньне і грамадзкае харчаваньне).

ЖЫТА, ПШАНІЦА:

З валавога збору ў 2.660,6 тоны здаць дзяржаве 64,3 тоны, пакінуць на насеньне 375 тон, страхавы фонд 56 тон, пакінуць для харчовых мэт рабочых 2.165,3 тоны.

АВЁС:

З валавога збору ў 2151 тону здаць дзяржаве 98 тон, пакінуць на насеньне 460 тон, страхавы фонд—46 тон, астатнія—1.547 тон лічыць цэнтралізаваным фуражна-кармавым фондам.

ІНШЫЯ ЗБОЖЖАВЫЯ:

З валавога збору ў 1.452 тоны здаць дзяржаве 35 тон, пакінуць на насеньне—270 тон, страхфонд—40 тон, таварнай прадукцыяй лічыць 1106 тон.

БАБОВЫЯ:

З валавога збору ў 448 тон здаць дзяржаве 8,2 тоны, пакінуць на насеньне—75 тон, страхавы фонд—11 тон, таварнай прадукцыяй лічыць 353,8 тон.

Астатнія ВІДЫ КУЛЬТУР, СІЛОСНЫЯ, КАРАНЬПЛОДЫ І ТРАВЫ лічыць, як фуражна кармавы фонд каапгасаў.

3. Згадзіцца з плянам сяўбы азімых 1933 г. па існуючых каапгасах: жыта 2000 га і пшаніцы—500 га. Па ўсіх астатніх культурах намеціць арыентыровачны рост пасеву: па бульбе—10 проц., па гародніне—12 проц., па яравых—4,8 проц., што складае агульны рост пасеўнай на 1729 га за лік паднятай цаліны, раскарчовак і мэліярацыі.

4. Устанавіць, што ўся таварная прадукцыя, за выключэньнем 10 проц. гародніны і бульбы, якія застаюцца ў распараджэньні дырэктароў каапгасаў для разьлікаў з рабочымі і членамі іх сямей за работу ў каапгасах, пад адказнасьць дырэктароў каапгасаў, павінна быць цалкам перададзена сваім ЗРК і гарраўкоопам для снабжэньня рабочых і грамадзкага харчаваньня.

Абавязаць дырэктароў каапгасаў, старшынь рабачкомаў і ЗРК здаць устаноўленую колькасьць збожжавай прадукцыі дзяржаве да 1 верасьня цалкам.

Катэгарычна забараніць дырэктарам каапгасаў і старшыням ЗРК выдаткаваньне кармавога фонду і збожжавай прадукцыі ў каапгасах без атрыманьня адпаведнага дазволу (нараду) ад Сельгаскіраўніцтва БКС.

Папярэдзіць усіх дырэктароў каапгасаў і старшынь ЗРК, што выдаткаваньне збожжа фуража без нарадаў будзе расцэньвацца як разбазарваньне дзяржаўных фондаў і вінаватыя ў гэтым будуць прыцягвацца да судовай адказнасьці.

5. У мэтах рашучай барацьбы са стратамі ў часе ўборкі, а таксама арганізацыі аховы ўраджаю ад раскраданьня і ўсякіх кулацкіх шкоднікаў,—прэзыдыумы ЦСПСБ і БКС, пад асабістую адказнасьць дырэктароў каапгасаў і прадпрыемстваў, прапануюць:

а) уборку збожжавых праводзіць па меры пасьпяваньня асобных вучасткаў, не чакаючы поўнага пасьпяваньня ўсяго ўраджаю. Устанавіць, як правіла, падграбаньне калосьсяў за жняяркамі к сцом. Устанавіць збожжаулоўнікі на жняярках, не дапускаючы ніякіх страт;

б) разам з выкарыстаньнем мяккай тары для перавозкі збожжа, дырэктаром каапгасаў і старшыням ЗРК прыняць усе меры для прыстасаваньня фурманак для перавозкі збожжа бяз мяккай тары (у скрынях, бочках і г. д.);

в) правесьці праверку гатоўнасьці складаў, сьвірнаў, збожжахавальняў, правесьці дэзынфэкцыю і неабходны рамонт іх. Прасіць Нарказем даць указаньне БелАШ аб прыняцьці мер з яго боку па зьнішчэньні шкоднікаў у сьвірнах. Адначасова абавязаць тав. ШЛЕЙФЭРА і дырэктароў каапгасаў скончыць у дэкадны тэрмін пачатае будаўніцтва збожжахавальняў;

г) устанавіць, як правіла, абавязковае стопроцантнае перакопваньне і баранаваньне бульбянішча, як раньняй, так і позьняй бульбы;

д) устанавіць, што за пастаноўку справы барацьбы са стратамі адказваюць: па каапгасе—дырэктар каапгасу і за вучастак—брыгадзір,—старэйшы рабочы вучастку;

е) дырэктаром каапгасаў безадкладна вылучыць адказных правераных брыгадзіраў для прыёмкі і ўліку прымаемых збожжавых культур, бульбы і гародніны. Вылучыць адказных за работу малатарань і прыёмку збожжа пры абмалоце. Прыход прадукцыі ўстанавіць пры абмалоце і ўборцы непасрэдна ў полі;

ж) прапанаваць старшыням ЗРК і гаррайпрафсаветам вылучыць адказных работнікаў (з ліку членаў праўленьня ЗРК, прэзыдыуму ГРПС) спэцыяльна для арганізацыі сталага нагляду за аховай ураджаю, вызваліўшы іх ад іншых работ на ўвесь перыяд уборкі.

6. Ускласьці адказнасьць за аказаньне дапамогі каапгасам на ФЗМК і іх старшынь, якія абавязаны безадкладна мабілізаваць увагу рабочых і членаў іх сямей на ліквідацыю адставаньня ў прапольцы, ахове ўраджаю і арганізацыі ўборкі. ЦП саюзаў, пад адказнасьць старшынь, зараз-жа пераключыць ня менш 60 проц. цэнтральных прафработнікаў на дапамогу ФЗМК у правядзеньні ўборкі ў каапгасах.

7. Лічыць зусім нецярпімым марудныя тэмпы будаўніцтва гароднясховішчаў і квасільных пунктаў. Прапанаваць дырэктаром каапгасаў, старшыням ЗРК, ЦРК і гарСТ скончыць будаўніцтва, рамонт, дэзынфэкцыю гароднясховішчаў і квасільных пунктаў да 1 верасьня.

У зьвязку з недахопам гароднясховішчаў, неадкладна распачаць падрыхтоўку да буртаваньня шляхам выбару і падрыхтоўкі адпаведных месц, саломы і вопытных буртаўшчыкоў. Даручыць тав. Шлейфэру да 15 жніўня даць каапгасам інструкцыю па буртаваньні.

8. У адпаведнасьці з гэтай пастановай прапанаваць гаррайпрафсаветам, райпрафсавецам і ОРС'ам забясьпечыць правядзеньне ўборкі і разьмеркаваньне ўраджаю па самадзейных гародах і каапгасах ТСТ.

# БЕЗАДКЛАДНА АЗДАРАВІЦЬ КІРАЎНІЦТВА САЎГАСА „ПАДБЯРЭЗЬЗЕ“!

*Вастрэй рэвалюцыйную пільнасьць!*

## БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ, ЗАЦІСК САМАКРЫТЫКІ, ЭЛЕМЭНТЫ ШКОДНІЦТВА.

Становішча з уборкай, абмалотам і здачай збожжа дзяржаве ў саўгасе «Падбярэзьзе», Ялагінскага сельсавету, больш чым нездавальняючае. Яшчэ ня скошана 22 га сенажаці, ня убрана 3500 пудоў ужо скошанага сена, жата 32 га жыта. Застаўся нязьвезеным з поля сухі ячмень—5 га.

Усё гэта здарылася з прычыны злачыннай бязьдзейнасьці дырэктара ПАХОМАВА, які не палічыў неабходным па-дзелавому, загадзя падрыхтавацца да уборачнай, не ўлічыў урокі веснавой сяўбы, і сьвядома дапускае самацёк у рабоце. Пахомаў па сутнасьці ашукваў вышэйстаячыя арганізацыі, кажучы, што у яго ўсё дрэннае добра. Што ж мы маем на самай справе?

План уборачнай быў складзены за два дні да уборкі. План не абгаварваўся ні на вытворчай нарадзе, ні сярод рабочых.

**ШКОДНІКІ НЕ ПАКАРАНЫ.**

З 20 коней—10 пакалечана. Шкоднікі коней—ВАЙЦЭХОЎСКІ ІГНАТ і ...ЖЫШЧА—не пакараны. Трактары „Інтэрн“ і «Фардзон» толькі 3 тыдні таму назад накіраваны для капітальнага рамонту. Спэцыяльных кадраў да работы на уборачных машынах не падрыхтавана. Норм выпрацоўкі няма. Не хапае сярпоў.

Між тым, замест дзелавой работы па безадкладным зьнішчэньні гэтых буйнейшых прарываў Пахомаў, у адказ на крытыку рабочых, дапускае заціск самакрытыкі, зволіў рабочых Дзюдзіна і Міхальчанку, якія крытыкавалі работу саўгаса. Пахомаў дэмабілізоўвае рабочы калектыў дрэнным улікам работы. Яшчэ 4 жніўня Пахомаў тэлеграфаваў Белсадгародтрэсту, што ўсё сена скошана і убрана, у той час, як тады было ня скошана 30 га і неўбраным засталося 5000 пудоў. Сена, што у стагу на вучастку Кашына, складалася мокрае. Такім чынам, факт «очковтирательства» з боку Пахомава бясспрэчны.

Сакратар партыйнай ячэйкі РАЗУМОЎСКІ бязьдзейнічае, ён у полі ня бывае, даручаны яму рамонт сельскагаспадарчых машын праваленьі. Жняярка-самаскідка не падрыхтавана, снопавязалка і малатарні таксама не падрыхтаваны.

Палітмасавая работа сярод рабочых саўгаса адсутнічае. Ніводная пастанова партыі і ўраду аб уборцы не прапрацавана.

**СТАРШЫНЯ РАБАЧКОМУ АДАРВАНЫ АД РАБОЧЫХ.**

Старшыня рабочага камітэту ЯРОМІНА толькі увесь час прасіджвае ў канторы, яна не ўзначаліла сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых. Так, да гэтага часу работніцы: КРАЎЧУНІС ГАЛЕНА, КУБАРНІЦКАЯ МАР'Я, РАЗУМОЎСКАЯ МАР'Я, ГАЛЬБЧЫКАВА ФРУЗА, ГАЛУБЧЫКАВА НАДЗЕЯ, КАТОВІЧ ГАННА, ПІМАНАВА СОНЯ, ЦЫКУНОВА ГАННА і ВАЙЦЭХОЎСКАЯ ФРУЗА ня маюць у сваіх групах групаводаў, ня ведаюць норм выпрацоўкі і свайго заработку. Яны гавораць: „Пехта казаў, што жаць ад снапоў, коп, а колькасьць ня ведаем“.

Паляводам Франтовым работа ўлічваецца так—хто колькі нажаў снапоў, на якім жыце: густым, альбо рэдкім—розьніцы не устаноўлена. Вялікія а л ь б о малыя снапы — усёроўна. Якую плошчу кожная зжынае, гэта яму, Франтову, непатрэбна. Нават, ён яшчэ на ведае, колькі га зжата і колькі маецца снапоў. КАЛОСЬСІ НЕ ПАДГРАБАЮЦЦА І БОЛЬШАСЬЦЬ БАБАК, СНАПОЎ З ПАД ЖНЯЯРКІ НЕ ПАКРЫВАЕЦЦА.

**ЗА ЯКАСЬЦЮ РАБОТЫ НІХТО НЕ САЧЫЦЬ.**

Рабочы СІРОТКІН, вылучаны па вязцы снапоў, больш часу праляжвае ў кустох і бабках, а Франтоў яму адзначае дзень работы. Франтоў сам спазьняецца на работу і рабочыя, чакаючы яго, трацяць дарэмна па некалькі гадзін. У полі ён бывае мала, а калі і бывае, то праходзіць спакойна міма агіднейшых фактаў шкодніцтва: рабочыя коні навязваюцца ў жыце, каровы пасуцца у пожнях, збожжаулоўнікі не ачышчаюцца, калосьсямі жыта цалкам услана як дарога, так і поле. Яна ходзіцца ля машын і ніякіх мер для зьнішчэньня гэтага ня прымаецца. Нарады на работу Франтовым даюцца толькі раніцой. Маючыйся у брыгадзе прадстаўнік гаркому КСМ ЗВОНКІН усё гэта бачыць, бязьдзейнічае і ніякіх мер ня прымае.

Слова за гарКК—РСІ і пракуратурай.

ДРАЗДОЎ, РАФАЛЮК, МІХАЛЬЧАНКА.

ЖНЯЯРКАМ—ПОЎНУЮ НАГРУЗКУ!

## КАЛІ НА ЖНЯЯРЦЫ ПРАЦУЕ БЫЛЫ ГАРАДАВЫ.

*„... Адзначыць выключна сур'ёзнае значэньне адбору работнікаў, працуючых на складаных сельскагаспадарчых машынах, са складу ведаючых, кваліфікаваных, адданых справе работнікаў...“. (З пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).*

◆ Вучастак «Падбярэзьзе». Загадчык вучастку, ён-жа і паляввод,—Франтоў. Жняярка самаскідка. Машыну рыхтавалі многа дзён таму назад. У кузьні яе зьбіралі з розных частак, работу вытвараў каваль ДРАЗДОЎ. Машына гатова, пастаўлена пад навес і чакае выхаду. Нарэшце, толькі 7 жніўня на жнейцы распачалі работу. Прымацаванага МАШЫНІСТА ня было—прышлося кавалю Драздову сесьці на машыну. Прывялі яму пару коняй. Праехаў ён пару разоў, коні прысталі. Але ў гэты дзень пашанцавала, бо саўгасу «Падбярэзьзе» вайсковая часьць дала на дзень пару коняй. Зноў пашла работа, праўда, з перапынкамі ў 20—30 мінут, бо снопаскідальны мэханізм з-за разьвінчанасьці балтоў часта прыпыняўся. Яшчэ не сьцямнела, а работа скончана. Што зроблена жняяркай - паляводам Франтовым ня ўлічана.

◆ 8 жніўня з раніцы была раса... —прабіла на гадзіньніку 12 гадзін. Абедзены перапынак. І толькі а 2 гадзіне дню выехалі ў поле. ПРЫЧЫМ, ЗА МАШЫНІСТА РАБОТАЦЬ НА ЖНЯЯРЦЫ пасадзілі былога гарадавога Паліцына. Гэты былы гарадавы Паліцын у адміністрацыі лічыцца ўдарнікам, атрымаў прэмію—парасёнка. Яго (Паліцына) памочнік—рабочы Цыкуноў Іван забраў чацьвёрку коняй, каб усіх адразу ж запрэгчы ў жняярку, і разам з Паліцыным накіраваліся ў поле, дзе ЎСЮ НОЧ СТАЯЛА БЯСПРЫТУЛЬНАЙ ЖНЯЯРКА. Праехаўшы два разы—машына сапсавалася. Тут-жа ХАДЗІЎ НА КАНЮШЫНЕ асядланы конь, на якім разьяжджае палявод Франтоў. Паехалі за кавалём Драздовым, далі яму каня і праз 15 мінут ён на месцы—аварыі. Паглядзеў, падвінціў балты, прайшло поўгадзіны і зноў былы гарадавы Паліцын засеў на жняярку. У яго доўгая пуга, цягне машыну тройка коняй. На адным вярхом сядзіць Цыкуноў з палкай і пачалася «малацьба» коняй: то пугай ззаду, то палкай збоку. Зжалі кавалак жыта, што каля самай Падбярэскай лясной дачы. Многа калосьсяў паслі коні, калі іх пасьвілі раней каля жыта. Нямала натоптана і паблытана. Машына толькі жала кавалкі з аднаго боку, бо на заваротах псавалася, пасьля кожнага заезду машыну заганялі зноў назад, нажы работалі ўхаластую, граблі гучна білі зубамі аб пляцформу. За жняяркай спраўляліся зьвязаць снапы 2 работніцы Краўчунас Галена і Кубарніцкая Мар'я, аб нормах выпрацоўкі і заработку яны ня ведалі: ім у канцы месяцу налічвалі зарплату, а ці правільна—яны таксама ня ведалі. „А добра было-б работаць, каб ведалі колькі і за што“ —гаворыць работніца Краўчунас.

На зжатым за 2 гадзіны кавалку ў 0,2 га многа пападаецца нязгрэбленага калосься. Больш таго, можна знайсьці палоскі памятага, але нязжатага жыта і гэта менш усяго турбуе старога царскага служку Паліцына—ён усё паглядае ў бок саўгаса, калі падвязуць падвячорак. Яму ёсьць чым самастрахавацца: норм выпрацоўкі не атрымаў, машына старая, псуецца, ну, а незграбаньне калосьсяў гэта ўжо ў саўгасе як сыстэма. З зерняўлоўніка высыпаецца праз верх зерне—ён не апаражняўся паўтара сутак. Гэта менш усяго турбуе Паліцына—так рабілі ўчора, так робім і сёньня. Мяха для выграбаньня з зерняўлоўніка калосьсяў і зярна няма. «Але на што ён гэты мех,—разважае Паліцын,—ад яго мала карысьці». Так ужо прышло і 9 гадзін увечары. Ён, Паліцын, даўно чакаў званка, і ў такт думкам Паліцына ў жняярцы зламалася калёсная ўтулка. Раптам Паліцын з памочнікам адпрэглі тройку коняй, падхапілі чацьвёртага каня, што імі быў навязаны ў жыце, і зьнікла з поля, ЗАСТАЎЛЯЮЧЫ БЯСПРЫТУЛЬНАЙ МАШЫНУ.

ЗА 6 З ПАЛОВАЙ гадзін у выніку зжалі 0,6 га жыта. Так прайшоў д з е н ь. Так нараджаўся ў саўгасе прарыў ва ўборцы.

АЗАРОНАК, МІХАЛЬЧАНКА, РАФАЛЮК.

## „А „МЭТПРОМАВЕЦ“ МАЎЧЫЦЬ...“

### Пастанова бюро парткалектыву завода „Чырвоны мэталіст“ ад 9 жніўня 1933 г.

Бюро парткалектыву зав. «Чырв. мэталіст», абмеркаваўшы агляд друку аб шматтыражцы „Мэтпромавец“ пад назвай „А „Мэтпромавец“ маўчыць...“ дадзены „Віцебскім пралетарам“ 4 жніўня, прызнае, што ацэнка работы газэты зусім правільная і па бальшавіцку выкрывае зусім недапушчальнае маўчаньне «Мэтпромаўца», у той час, калі наша прыгарадная гаспадарка сяўбу скончыла з вялікім спазьненьнем, калі 1-я і другая праполкі таксама ішлі з вялікім пратэрмінаваньнем, маўчала нават тады, калі гаспадарцы ўручылі рагожны сьцяг. Аб гэтым апошнім факце ў газэце няма ніводнага радку і, такім чынам, рабочая маса завода ня была сваечасова мабілізавана на змыцьцё ганебнай плямы.

Бюро парткалектыву прызнае, што з яго боку адсутнічала дастатковае кіраўніцтва рэдкалегіяй шматтыражкі «Мэтпромавец», якая дапусьціла палітычную памылку, не мабілізаваўшы масы на сваечасовае выкананьне задач па праполцы.

Бюро парткалектыву пастанаўляе:

У бліжэйшыя дні склікаць рабкораўскі актыў, дзе абгаварыць пытаньне аб паляпшэньні якасьці газэты і заводзкага нізавога друку.

Рэдактару газэты „Мэтпромавец“ т. Конюхаву пачаць сыстэматычна асьвятляць пытаньне аб падрыхтаванасьці да ўборкі і ход самой уборкі ў каапгасе і падшэфным сельсавеце.

На бюро парткалектыву 16 жніўня заслухаць сакратара парт'ячэйкі каапгаса аб падрыхтаванасьці да ўборкі.

Бюро цэхпарт'ячэек заслухаць парт-арганізатараў аб становішчы уборкі ў падшэфных калгасах з намячэньнем канкрэтных мерапрыемстваў па якаснай уборцы, ахове ураджаю і сваечасовай здачы збожжа і бульбы дзяржаве.

Вылучыць брыгаду ў падшэфны сельсавет для правядзеньня масавай працы вакол задач уборкі і хлебаздачы.

## ПАБУДУЕМ АВІЯЭСКАДРЫЛЬЛЮ ІМЯ Л. М. КАГАНОВІЧА.

Віцебскае аддзяленьне Дзяржбанку Бяг. рахунак № 160|2069

# Партыйныя калектывы і прафарганізацыі чыгункі, фабрык „Сьцяг індустрыялізацыі“, „КІМ“ і імя Цэткін павінны паказаць узоры бальшавіцкай рэалізацыі ініцыятывы мас.

## У бліжэйшыя два дні скончыць поўнасьцю збор сродкаў на пабудову авіяэскадрыльлі!

**На 14 жніўня паступіла 83022 р.**

### ГАНЕБНА АДСТАЮЦЬ У ЗБОРЫ СРОДКАЎ.

ЧЫГУНКА—старшыня райпрафсачу ДЗЬМІТРОВІЧ.

Фабрыка «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ»—старшыня фабкому ДЫМАНТ.

Фабрыка „КІМ“—старшыня фабкому КАШНІКАВА.

Фабрыка імя КЛАРЫ ЦЭТКІН—старшыня фабкому ШУЛЬМАН.

### ЗАВОД „КАМІНТЭРН“ ВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ.

Завод «Камінтэрн» 14 га жніўня выканаў заданьне на 100 процантаў. Унесена ўсяго 2000 рублёў.

На 13 жніўня засталіся несабранымі ў фонд пабудовы авіяэскадрыльлі імя Л. М. Кагановіча звыш 30 тысяч рублёў. Апошнія дні замест падвышэньня тэмпаў збору грошай паказваюць рэзкае зьніжэньне. Калі за 9 жніўня на бягучы рахунак № 160/2069 паступіла 18145 руб., 10 жніўня—14469 руб., то 11 жніўня—8270 руб. і 13-га—10177 руб.

Вялікая запазычанасьць маецца, у першую чаргу, за чыгункай, фабрыкамі «КІМ», «Сьцяг індустрыялізацыі» і імя Клары Цэткін. Гэтыя прадпрыемствы, якія, па-сутнасьці, вырашаюць лёс хутчэйшага і поўнага выкананьня застаўшайся часткі заданьня па зборы сродкаў, агідна адстаюць, цягнуць увіз усю крывую выкананьня пляну.

Асабліва ганебна адставаньне чыгункі: васемнаццаць тысяч рублёў павінна яна сабраць у фонд пабудовы эскадрыльлі, а між тым ня здадзена амаль ніводнага рубля. Агідней усяго, што ў паасобных цэхах чыгункі, як, напрыклад, у паравозьнікаў праведзена адпрацоўка ў фонд пабудовы эскадрыльлі, але-ж грошы на бягучы рахунак Дзяржбанку НЕ ПЕРАВЕДЗЕНЫ. Чаму гэта так? Наўрад ці знойдуць чыноўнікі і раз гільдзяі з райпрафсачу і райкіраўніцтва якое-небудзь апраўданьне гэтаму зьявішчу. Тлумачыць гэта можна толькі безадказнасьцю і адсутнасьцю пачуцьця адказнасьці за даручаную справу, у першую чаргу з боку старшыні райпрафсачу тав. ДЗЬМІТРОВІЧА.

Таксама трэба спыніцца на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі». Кіраўнікі фабрычнай ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ, абяцаўшы ў свой час усё «шапкамі закідаць», у тэрмін і поўнасьцю выканаць заданьне, дагэтуль ня выканалі яго. Пяць тысяч рублёў лічыцца яшчэ за «Сьцягам індустрыялізацыі»! Грош цана, т. ДЫМАНТ, вашым запэўніваньням і ўрачыстым абяцаньням, раз яны не падмацаваны БАЛЬШАВІЦКАЙ СПРАВАЙ.

Ганебна, агідна плятуцца ў хвасьце фабрыкі «КІМ» і імя Клары Цэткін. І тав. КАШНІКАВА і тав. ШУЛЬМАН праяўляюць дзіўную бястурботнасьць у адносінах хутчэйшага выкананьня заданьня.

Трэба адзначыць, што і нізавы друк вышэйпаказаных прадпрыемстваў абсалютна нездавальняюча ўдзельнічае ў кампаніі па зборы сродкаў на пабудову авіяэскадрыльлі імя Л. М. Кагановіча. «САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ТРАНСПАРТ» (рэдактар БАСІН), „СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ“ (рэдактар УГОРЭЦ), „ПАНЧОШНІЦА“ (рэдактар ЭПШТЭЙН) да гэтага часу павярхоўна, выпадкова вядзе на сваіх старонках кампанію, зусім забываючы аб яе вялізарнейшым палітычным значэньні і значэньні для ўмацаваньня абароназдольнасьці нашай краіны.

Пасьля таго, як мы пісалі аб гаганебным адставаньні вышэйпаказаных прадпрыемстваў у нумары ад 12 жніўня, адзначаем гэта і сёньня, трэба паставіць пытаньне проста:—ну, а вы, т. КІРЫЛАЎ — партарганізатар 6 га эксплёатацыйнага раёну, тт. РОХКІНД, БАСКІН і ЖУРАЎ—сэкратары партмалектываў „Сьцяга індустрыялізацыі“, „КІМ“ і фабрыкі імя Клары Цэткін, як ваша думка на гэты конт? Ці дапушчальна адставаньне і такое ганебнае вашых прадпрыемстваў?

Безумоўна, не! І гэта таварышы павінны і спадзяемся ў поўнай меры ўсьведамляюць, каб неадкладна, за сёньняшні і заўтрашні дні дабіцца выкананьня пляну збору сродкаў на пабудову авіяэскадрыльлі.

Да «дзяю авіяцыі»—18 ЖНІЎНЯ Віцебшчына павінна НЯ ТОЛЬКІ ВЫКАНАЦЬ, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ заданьне па зборы сродкаў на пабудову авіяэскадрыльлі імя Л. М. Кагановіча. За гэта нясуць адказнасьць, у першую чаргу, чыгунка, «Сьцяг індустрыялізацыі», «КІМ» і фабрыка імя Клары Цэткін, іх партыйныя і прафсаюзныя кіраўнікі тт. Кірылаў і Дзьмітровіч, Рохкінд і Дымант, Баскін і Кашнікава, Жураў і Шульман.

### У ФОНД ПАБУДОВЫ ЭСКАДРЫЛЬЛІ.

На 13 жніўня на бягучы рахунак № 160/2069 паступіла: ад мясцкому Дзяржбанку — 168 руб. 30 кап., 28 школы — 106 руб. 17 кап., фабрычнапрацоўнай калёніі —250 руб., рынкавага камітэту—102 руб., саюзу працасьветы—275 р. 43 кап., яўрэйскага дашкольнага дому—28 руб. 80 кап., фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі»—3000 руб., Белпэдтэхнікуму—124 руб., Торгсіну—10 р., ЗВК—350 руб., СМАБ—86 руб., 43 ветвучастку—663 руб. 32 кап., махорачнай фабрыкі—500 руб., хлебазаводу—50 руб., фабрыкі імя Клары Цэткін—3000 руб., кантоны сувязі—168 руб. 50 кап., аддзелу індывідуальных заказаў фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі“—500 руб., ЗРК фабрыкі „Дзьвіна“—152 руб. 55 кап., Сампрамсаюзу—42 руб. 67 кап., а разам за дзень—10 177 руб. 74 кап.

* *

Калектыў ДЗЯРЖАЎНАГА ЯЎРЭЙСКАГА ТЭАТРУ БССР, які гастралюе зараз у Віцебску, адлічыў аднадзённы заробатак на пабудову авіяэскадрыльлі імя т. Кагановіча. Сума ў 450 рублёў пераведзена ў Дзяржбанк на бягучы рахунак.

Калектыў Дзяржтэатру БССР выклікае насьледваць яго прыкладу ўсе беларускія тэатры і мастацкія ўстановы.

---

## АБ ПРЫЗЫВЕ 1911 ГОДУ.

### *Загад Рэвалюцыйнага ваеннага савету СССР № 133.*

10 жніўня 1933 году, г. Масква.

1. Прызваць на сапраўдную ваенную службу ў рабоча-сялянскую Чырвоную армію ў пэрыяд з 1 верасьня па 1 лістапада г. г. грамадзян нараджэньня 1911 г. і старэйшых узростаў, якім скончыліся адтэрміноўкі прызыву.

Дакладныя тэрміны прызыву ўстанавіць рэвалюцыйным ваенным савета акруг.

2. Грамадзян нараджэньня 1903 г., якія раней карысталіся адтэрміноўкамі, ад прызыву аслабаніць і пералічыць у запас першай чаргі.

Падстава: Артыкул 131 закону аб абавязковай ваеннай службе.

Народны камісар па ваенных і морскіх справах і старшыня РВС СССР ВАРАШЫЛАЎ.

### *Загад Рэвалюцыйнага ваеннага савету СССР № 134.*

10 жніўня 1933 г., г. Масква.

1. Зволіць з радоў рабоча сялянскай Чырвонай арміі ў доўгатэрміновы водпуск радавы і малодшы начальніцкі склад тэрміновай службы:

а) з частак з двохгадовым тэрмінам службы—прызыву 1931 г.;

б) з частак з трохгадовым тэрмінам службы—прызыву 1930 г.;

в) з частак з чатырохгадовым тэрмінам службы—прызыву 1929 г.

г) асоб, якія праходзяць сапраўдную ваенную службу ў парадку Х разьдзелу закону аб абавязковай ваеннай службе, вытрымаўшых іспыты на годнасьць сярэдняга начальніцкага складу запасу.

2. Звальненьне вытварыць:

а) з сухаземных, паветраных і морскіх сіл у пэрыяд з 25 верасьня па 15 сьнежня г. г.;

б) з канвойных войск СССР—да 15 сьнежня г. г.;

в) з унутраных войск АДПУ—да 15 студзеня 1934 г. і з прымежнай аховы—да 1 красавіка 1934 г.

3. Пераменны радавы і малодшы начальніцкі склад тэрытарыяльных частак прызыву 1928 г. зволіць у запас РСЧА па скончэньні збору тэрытарыяльных частак бягучага году.

4. Загад абвясьціць ва ўсіх ротах, эскадронах, батарэях, камандах, атрадах, дывізьёнах, суднах і экіпажах.

ПАДСТАВА. Арт. 40 закону аб абавязковай ваеннай службе.

Народны камісар па ваенных і морскіх справах і старшыня РВС СССР ВАРАШЫЛАЎ.



ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ—ПЕРШАКЛЯСНАЯ ШКОЛА ПАЛІТЫЧНАГА І ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНА-КЛЯСАВАГА ВЫХАВАНЬНЯ Ў ДУХУ БАРАЦЬБЫ ЗА САЦЫЯЛІЗМ ПРАЛЕТАРАЎ І КАЛГАСЬНІКАЎ.

*Што павінен ведаць дапрызыўнік аб прызыве ў 1933 г.*

### Які тэрмін службы чырвонаармейца?

Прызыўнік павінен ведаць, што тэрмін сапраўднай службы ў Чырвонай арміі ўстаноўлен у ПЯЦЬ ГОД. З гэтага тэрміну некаторы час чырвонаармеец служыць у вайсковай часьці, а другую частку часу знаходзіцца ў ДОЎГАТЭРМІНОВЫМ АДПАЧЫНКУ.

У КАДРАВЫХ сухапутных часьцях чырвонаармеец служыць у часьці 2 гады і ў доўгатэрміновым адпачынку—3 гады. У морскім флёце ён служыць у часьці ці на караблі 3—4 гады і ў доўгатэрміновым адпачынку -1 —2 гады.

У ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫХ ЧАСЬЦЯХ чырвонаармеец служыць 8 месяцаў на працягу пяці год: у першы год ён прызываецца на зборы ў лягеры на 3 месяцы, астатнія 5 месяцаў адслужвае па часьцях на працягу застаўшыхся 4 год, прызываючыся на 1 месяц у лягер і на 2-3 дні ўзімку па месцы жыхарства.

УНЕВАЙСКАВІКІ на працягу пяці год прызываюцца на зборы ня звыш чым на 3 месяцы штогод, пры чым частку часу (10-12 дзён) праводзяць у лягерох. Сваю службу уневайскавікі праходзяць, у асноўным, без адрыву ад вытворчасьці, па асобай праграме.

Асобым парадкам праходзяць службу прызыўнікі, што маюць сярэднюю і вышэйшую адукацыю.

Той, хто навучаецца ў вышэйшай навучальнай установе, дзе ўведзена ВЫШЭЙШАЯ ЎНЕВАЙСКОВАЯ ПАДРЫХТОЎКА, праходзіць службу ў сябе ў вузе, навучаючыся па асобай праграме. Канчаючы вуз, ён атрымлівае званьне камандзіра запасу, да прызыву не зьяўляецца і ў мірны час непасрэдна ў арміі ня служыць.

Тыя, хто праходзіў вышэйшую дапрызыўную падрыхтоўку і скончыў яе да 31 сьнежня 1932 г., прызываюцца, але служаць у арміі ня 2 гады, а 6 месяцаў.

Той, хто скончыў школу-ДЗЕВЯЦІГОДКУ ці рабфак, тэхнікум з аб'ёмам ведаў ня менш дзевяцігодкі, служыць у арміі 1 год (ад-эгоднік) і пры звальненьні атрымлівае званьне камандзіра ўзводу запасу. Аднагоднікі служаць у тым родзе войск, які найбольш адпавядае іх ведам (напрыклад, электратэхнікі—у часьцях сувязі).

Той, хто мае веды ў аб'ёме на ніжэй школы-сямігодкі, служыць поўны тэрмін, але мае перавагу пры паступленні на вучобу і ў палкавыя школы малодшага камскладу і ў ваенныя школы, што рыхтуюць сярэдні начсклад.

На зьмену 1911 году, што ідзе ў армію, з восені гэтага году пачынае ДАПРЫЗЫЎНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ 1913 год і працягвае 1912 год. Вучоба дапрызыўніка праходзіць па 120-гадзіннай праграме пры пунктах Асоавіяхіму, а ў некаторых нацыянальных рэспубліках—пры чырвонаармейскіх часьцях. Вучні сярэдніх школ, замест дапрызыўнай падрыхтоўкі, праходзяць так званае ВАЕННАЕ НАВУЧАНЬНЕ НА ВУЧАЮЧЫХСЯ СЯРЭДНЯГА ЗЬВЯНА пры сваіх школах.

(«Б. П.»).

## *ЗА ГРАНІЦАЙ.*

### КАМПАРТЫЯ ГЕРМАНІІ НА БАЯВЫХ ПАЗЫЦЫЯХ.

Чатыры факты з гісторыі слаўнай барацьбы з фашызмам.

Германскі фашызм намагае ўсе свае сілы, каб задушыць рэвалюцыйную прапаганду сярод рабочых і за ваяваць апошніх на свой бок. Для гэтай мэты фашысты вядуць самую шырокую агітацыю, ствараюць фашысцкія арганізацыі на прадпрыемствах. З другога боку, яны выкідваюць з фабрык, арыштоўваюць, ссылаюць у канцлягеры тых рабочых, якія праяўляюць малейшыя адзнакі апазыцыйных настрояў.

Але ўсе гэтыя мерапрыемствы не

РОТ ФРОНТ!

даюць жаданага рэзультату. КОЖНЫ ДЗЕНЬ ПРЫНОСІЦЬ НОВЫЯ ФАКТЫ РОСТУ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ НАСТРОЯЎ СЯРОД РАБОЧЫХ, УЗМАЦНЕНЬНЯ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПРАПАГАНДЫ І АКТЫЎНАСЬЦІ на прадпрыемствах.

Вось некалькі фактаў за адзін толькі дзень.

ФАКТ ПЕРШЫ. 21 ліпеня, а 3 гадз 15 мінут дню на буйнейшым заводзе ўсеагульнай кампаніі электрычнасьці «АЭГ» НА БРУНЭНШТРАСЭ ў Бэрліне па сканчэньні работы, калі рабочыя выходзілі з брамы, каля 50 рэвалюцыйных рабочых АВАЛОДАЛІ ЗАВАДЗКІМ РАДЫЁПЕРАДАТЧЫКАМ І ПАЧАЛІ ПЕРАДАВАЦЬ БАЯВЫЯ КАМУНІСТЫЧНЫЯ ЛЁЗУНГІ. Адначасова ішла раздача соценяў камуністычных лістовак. Гэта рэвалюцыйнае выступленьне, праведзенае літаральна на вачох у фашысцкай завадзкой аховы, зрабіла вялікае ўражаньне на рабочых.

ФАКТ ДРУГІ НА КАБЕЛЬНЫМ ЗАВОДЗЕ Ў БЭРЛІН ОБЭРШПРЭІ ў часе агульнага сходу, склiканага завадзкой фашысцкай арганізацыяй, ВЫСТУПІЎ РАБОЧЫ-КАМУНІСТ З ПРАМОВАЙ, У ЯКОЙ ВЫКРЫВАЎ ХАРАКТАР ФАШЫСЦКАЙ ПАЛІТЫКІ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ, гаварыў аб росьце цэн на прадметы першай неабходнасьці, аб фашысцкай дыктатуры ў прафсаюзах. Усе спробы старшыні сходу пазбавіць прамоўцу слова натыкаліся на патрабаваньні ўсіх рабочых, у тым ліку і членаў нацыянал-сацыялісцкай партыі, не перашкаджаць прамоўцы гаварыць. Прамова камуніста працягвалася каля поўгадзіны пры напружанай увазе ўсяго сходу.

ФАКТ ТРЭЦІ На КНІЖНАЙ ФАБРЫЦЫ Гамеля ў ШАРЛОТЭНБУРЗЕ з вялікай помпай рыхтаваліся да «урачыстасьцяў» па асьвячэньні сьцягу мясцовай фашысцкай арганізацыі. Перад самым пачаткам урачыстага сходу высьветлілася, што ФАШЫСЦКІ СЬЦЯГ ЗЬНІК, ЗЬНІШТОЖАН КІМСЬЦІ З РАБОЧЫХ. Усе спробы знайсьці вінаватага гэтага „сьвятотатства“ засталіся бяз посьпеху.

ФАКТ ЧАЦЬВЁРТЫ. Бэрлінскі АТРАД ШТУРМАВІКОЎ № 102, казармы якога разьмешчаны ў рабочым квартале Вэдынзе, нядаўна быў ПАГАЛОЎНА ЗАБЯСЬПЕЧАН НЕЛЕГАЛЬНЫМ НУМАРАМ «РОТЭ ФАНЭ». Гэта было зроблена ў часе выкананьня атрадам абавязковай працоўнай павіннасьці. З прычыны сільнай сьпякоты штурмавікі зьнялі свае тужуркі і, калі яны іх зноў апранулі, то ў кішэні ў кожнага аказаўся нумар «Ротэ Фанэ» Зробленае безадкладнае самае суровае расьсьледваньне не змагло выявіць віноўнікаў гэтага акту.

### Антыфашысцкая барацьба геранічнай КПГ.

БЭРЛІН. Друк адзначае значнае ўзмацненьне дзейнасьці кампартыі. Эсэнскі начальнік паліцыі ў спэцыяльнай адозьве да насельніцтва перасьцерагае ад «праяўленьня цікавасьці да камуністычнай літаратуры». «З нячуванай дзёрзкасьцю, — гаворыцца ў адозьве,—камуністы распаўсюджваюць антыдзяржаўную літаратуру. Лістоўкі падкідваюцца ўначы ля брам дамоў, у скрынкі для лістоў, грамадзкія ўборныя, вокны і фабрычныя памяшканьні. Цэлыя пакеты камуністычных матар'ялаў скідваюцца сярод белага дню з верхніх паверхаў магазынаў на вуліцу». Проста пагражаючы судом Лінча, начальнік паліцыі перасьцерагае распаўсюджвальнікаў нелегальных лістовак «ад справядлівага гневу штурмавікоў».

Пры вялікай аблаве ў Мюнхэне нібы выяўлена падпольная друкарня, надрукаваўшая камуністычныя газэты. Згодна паліцэйскага паведамленьня, друкарская машына была задзелана ў дрыўляным стале. Арыштавана і накіравана ў канцлягер 68 рабочых. У Браўншвэйгу аблава цягнулася 2 дні. Арыштавана 250 чалавек, з якіх 60 прыгавораны да розных тэрмінаў турмы і 40 чакаюцца суду. У аблаве на рыбацкую калёнію паблізу Дартмунду прымала ўдзел 16 камаанд штурмавікоў. Нібы выяўлена падпольная друкарня. Шмат рабочых арыштавана.

* *

МЮНХЭН. Баварскі міністр юстыцыі Франк увёў асабліва строгі рэжым у баварскіх турмах. Зьняволеным забаронена пісаць лісты і скаргі Франк выходзіць з „прынцыпу“, што карныя рэпрэсіі павінны базавацца на „ідэе недапушчэньня“.

### ГЕРМАНІЯ НЯ СПЫНЯЕ АНТЫАЎСТРЫЙСКАЙ ПРАПАГАНДЫ.

ВЕНА. У радыё прамове з Мюнхэну, высланы ў свой час з Аўстрыі кіраўнік аўстрыйскіх нацыянал-сацыялістаў Габіхт, паміж іншым, заявіў, што аўстрыйскі ўрад прадстаўляе групу тэрарыстаў, захапіўшых уладу, і мае дапаможную паліцыю Аўстрыі. Урадавая «Рэйхпост» канстатуе, што Германія парушыла слова, дадае Італіі—спыніць радыё-прапаганду супроць Аўстрыі. Становішча на аўстра-германскай граніцы надзвычай напружанае. У апошнія дні зноў адбываліся сутычкі паміж германскімі нацыянал-сацыялістамі і аўстрыйскімі хэймвэрамі.

### ЗРЫЎШЧЫК СВАЕЧАСОВАГА ВЫХАДУ „ВІЦЕБСКАГА ПРАЛЕТАРА“ ПЛЯСУНОЎ ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ Ў ДРУКАРНІ.

Адміністрацыяй друкарні імя Камінтэрну з няты з работы ў друкарні з прыцягненьнем да крымінальнай адказнасьці Плясуноў, які сьвядома затрымаў на адну гадзіну 5 мінут друкаваньне газэты „Віцебскі пралетары“, у выніку чаго частка падпісчыкаў атрымала газэту са спазьненьнем.

Урок справы Плясунова павінен быць моцна ўлічаны кожным работнікам друкарні „Камінтэрн“.

Малейшая праява разгільдзяйства, расхлябанасьці, безадказных адносін да работы ў друкарні може сваім простым вынікам затрымку ў выхадзе газэты, альбо яе няд бракасны тэхнічны выпуск.

Забясьпечыць сваечасовы выхад і самую высокую якасьць тэхнічнага выпуску газэты „Віцебскі пралетары“— вось, што павінна быць баявым лёзунгам трыкутніка і ўсёй масы рабочых друкарні „Камінтэрн“.

### Папраўка.

У зьмешчаным у нумары за 12 жніўня допісе (на першай старонцы) пад назвай „Калгас імя МОПР плян збожжапаставак азіміны выканаў на 100%“ па недагляду ня была зьмешчана заўвага ад рэдакцыі. Зьмест заўвагі наступны:

„Адзначаючы атрыманыя за апошнія дні, дзякуючы крутому пералому, дасягненьні калгаса (поўнае выкананьне пляну збожжапаставак азіміны), мы разам з тым зьвяртаем асаблівую ўвагу як праўленьня калгаса, так і Сялюцкай партыйнай ячэйкі і сельсавету на неабходнасьць неадкладна ўлічыць надзвычайна сур'ёзны сыгнал з калгаса, якім зьяўляецца допіс аб старшыні калгаса Веташкове (зьмешчаны на 3 старонцы, № газэты 185).

Чакаем ад праўленьня калгаса і партыйнай ячэйкі паведамленьня аб прынятых мерах.

Падкрэсьліваем, што атрыманае калгасам за апошнія дні дасягненьне трэба абавязкова замацаваць далейшай напружанай і высокаякаснай работай, недапускаючы ні малейшых праяў „гал вакружэньня ад посьпехаў“, цьвёрда памятаючы пра безадкладную неабходнасьць ліквідацыі маючыхся ў рабоце калгаса буйнейшых прарываў“.

---

## Агульнагарадзкі зьлёт рабкораў-ударнікаў

склікаецца 19 жніўня, а 7 гадз. увечары, у вялікай залі Палацу працы (пляц Волі).

ПАРАДАК ДНЮ:

Вынікі ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, пастанова ЦК КП(б)Б аб становішчы віцебскай партарганізацыі і задачы рабкораў Віцебшчыны (дакладчык—сэкратар гаркому КП(б)Б тав. І. Г. ЖУРАЎЛЁЎ).

Рэдакцыя газэты „Віцебскі пралетары“.

ПРАПАЛА ДЗЯЎЧЫНА Кацярына Мікітаўна СУЧКОВА 10 год. Прыкметы: аднаго вуха няма, другое прыросшае вочы цёмныя, апранута ў шэрае паматнянае адзеньне. Ведаючых месца яе знаходжаньня ПРОСЬБА ПАВЕДАМІЦЬ ПА АДРАСЕ: вёска Чаркасы, ст. Крынкі, калгас «14 Кастрычнік», Ганне Сучковай.

729—1—1.

### ЗАГАД № 3

**інспэктара снабжэньня віцебскага гарсавету ад 11-га жніўня 1933 г.**

У сувязі з тым, што за апошні час маецца рад заяў аб згубе і крадзяжы наборных дакумантаў насельніцтва гораду, віцебскі гарснаб прапануе:

1. Дырэктарам усіх прадпрыемстваў і загадчыкам устаноў ПА 16 ЖНІЎНЯ 1933 ГОДУ зрабіць праверку выданых наборных дакумантаў, паставіўшы на хлебныя карткі жніўня месяцу дзе № 30 ПЯЧАТКУ, ЧЫСЛО ПРАВЕРКІ і подпіс адказнага за выдачу наборных дакумантаў. Адзнаку на хлебных картках вытварацъ выключна працуючым на прадпрыемствах і ўстановах на дзень праверкі.

2. Усім старшыням ЗРК, ЦРК водпуск хлеба 16 жніўня рабіць ВЫКЛЮЧНА ПА НАБОРНЫХ дакумантах, якія заверены прадпрыемствамі, або ўстановай, згодна п. 1 гэтага загаду.

3. Загадчыку бюро наборных дакумантаў да 16 жніўня РАБІЦЬ ПРАВЕРКУ НАБОРНЫХ ДАКУМАНТАЎ па неарганізаваным насельніцтве.

СТАРШЫНІ СТРАХКАСЫ правесьці праверку наборных дакумантаў, выдадзеных ІНВАЛІДАМ ПРАЦЫ.

4. Усе ізьятыя дакуманты ў час праверкі па-інны быць здадзены гарснабу НЕ ПАЗЬНЕЙ 18 ЖНІЎНЯ 1933 ГОДУ.

Член прэзыдыуму гарсавету і старшы інспэктар гарснабу ШПІЛЁЎ.

748—3—1

### ЗАГАД па гарАНА

**ад 10 жніўня.**

Усе настаўнікі рабочых школ І і ІІ канцэнтраў 16 жніўня 1933 г. да 7 гадз. увечары павінны зьявіцца ў Дом асьветы на нараду па пытаньнях падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Да незьявіўшыхся будуць прыняты адпаведныя меры.

738—2—2 Інспэктар палітасьветы ЧАРНЯК.

### Беларускі вучэбны камбінат сувязі АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР СТУДЭНТАЎ

На 1-ы курс дзённага тэхнікума сувязі, з адрывам ад вытворчасьці: на аддзяленьні: тэлефоннае, тэлеграфнае, радыё і эканамічнае.

На 1 і 2 курсы вячэрняга тэхнікума, без адрыва ад вытворчасьці.

У школу ФЗВ сувязі на аддзяленьні: тэлеграфнае, тэлефоннае, радыё і фінансавае.

Тэхнікум сувязі рыхтуе тэхнікаў 1 рангу па адпаведнай спэцыяльнасьці, а школа ФЗВ сувязі—кваліфікаваных манцёраў па тэлеграфіі, тэлефоніі, радыё, памочнікаў бухгальтароў і рахункаводаў.

У тэхнікум і школу ФЗВ прымаюцца: рабочыя, іх дзеці, сувязісты і іх дзеці, калгасьнікі, іх дзеці і інш., узростам ад 16 год з адукацыяй за сямігодку.

УВАГА. На 2 курс вячэрняга тэхнікуму прымаюцца асобы на базе 8—9-годкі.

Пры паступленьні адбудуцца іспыты: па матэматыцы, фізыцы, белмове, рускай мове і грамадазнаўстве.

Аб тэрміне залікаў будзе даслана асабістае паведамленьне кожнаму залічанаму. Дакуманты ў арыгіналах прадстаўляць наступныя: 1) анкету, засьведчаную партыйнымі або савецкімі арганізацыямі, 2) даведку аб адукацыі, 3) даведку аб здароўі, 4) даведку аб узросьце, 5) даведку аб матар'яльным і сацыяльным становішчы, 6) дзьве фотакарткі. 7) аб вайсковай павіннасьці.

Залічаныя студэнты і вучні ФЗВ з раёнаў забясьпечваюцца інтэрнатам. Ёсьць таксама сталоўка.

Прыём заяў да 20 жніўня 1933 г. Заявы накіроўваць разам з дакумантамі па адрасе: Менск, Камароўка, Лясная вул., дом № 28.

736—2—1

ДЫРЭКЦЫЯ.

### Адчынен асеньні набор у ФЗВ швэйнікаў.

**НАБОР 300 ЧАЛ.**

Прымаюцца вучні на базе 5, 6, 7 груп 1917, 1916 і 1915 г. г. нараджэньня.

Пры паступленьні патрэбны наступныя дакуманты: 1) мэтрычны выпіс, 2) даведка аб сацыяльным паходжаньні, 3) аб адукацыі.

Заявы прымаюцца ў памяшканьні ФЗВ (Базарная вул., № 10) ад 9 ці да 5-ці гадз. дню. Прыём заяў да 15 жніўня.

Прынятыя вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай. Пачатак заняткаў 1-га верасьня г. г.

623—5—5

ДЫРЭКЦЫЯ.

### Бабруйскі лесатэхналёгічны тэхнікум абвяшчае ЧАРГОВЫ НАБОР СТУДЭНТАЎ на першы курс аддзяленьняў:

1) фанэрнае—60 асоб, 2) сталярна-будаўнічых дэталяй і дэталяй сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва—30 асоб на дзённы і 60 асоб на вячэрні.

У тэхнікум прымаюцца скончыўшыя сямігодкі, вячэрнія школы павышанага тыпу і іншыя школы, адпавядаючыя праграмам сямігодак, альбо скончыўшыя падрыхтоўчыя курсы ў тэхнікум з абавязковым трыманьнем іспытаў па грамадазнаўстве, белмове і літаратуры, рускай мове і літаратуры, матэматыцы і фізыцы ў аб'ёме ведаў па праграме сямігодкі.

Жадаючыя паступіць павінны падаць заяву на імя прыймовай камісіі па адрасе: гор. Бабруйск, Савецкая 76, лесатэхнікуму, да 20 жніўня. З 20 па 28 жніўня—іспыты па вызначаных дысцыплінах. Заняткі пачнуцца з 1 верасьня.

Да заяў павінны быць прыкладзены наступныя дакуманты: 1) анкета, засьведчаная прафарганізацыямі, а для сялян—сельсаветам, 2) пасьведчаньне аб адукацыі (абавязкова арыгінал), 3) пасьведчаньне аб сацыяльным паходжаньні і праве голасу паступаючага і бацькоў і сацыяльным становішчы ў сучасны момант (сялянам даведкі ад сельсавету аб памеры с. г. падатку), 4) мэтрычную даведку, 5) даведку аб адносінах да вайсковай павіннасьці, 6) даведку ад урача аб стане здароўя, 7) дзьве фотакарткі, 8) паштовых марак на 40 кап.

Пры непрадстаўленьні якіх небудзь дакумантаў з пераліча ных у аб'яве, прыймовай камісіяй заява ня будзе разглядацца.

Прынятыя студэнты ў адпаведнасьці з пасьпяховасьцю, сац. становішчам і забясьпечанасьцю атрымліваюць дыфэрэнцыяваную стыпэндыю на першым курсе да 50 руб. Студэнты з іншых гарадоў будуць забясьпечаны інтэрнатам, а ўсе студэнты харчаваньнем у сталоўцы і пайком нараўне з рабочымі трэсту фанэрнай прамысловасьці, якому тэхнікум падпарадкаван (1 катэгорыя 1 сьпіс).

Правілы для паступаючых на вячэрні курс тэхнікуму тыя, што і на дзённы, за выключэньнем таго, што навучаньне праходзіць без адрыву ад вытворчасьці.

658—3—3.

ЗРК МЭТАЛІСТАЎ прапануе ўсім трымацелям прамтаварных авансавых ордэраў, выданых праўленьнем ЗРК, да 25 жніўня атрымаць па іх у магазынах ЗРК прамтавары. Нежадаючыя атрымліваць прамтавары, могуць атрымаць наяўныя грошы, пры ўмове адсутнасьці тых прамтавараў, на якія выдадзены ордэры.

Пасьля ўказанага тэрміну ордэры ануляюцца і выплата грошай па іх вытварацца ня будзе

744—2—2.

Даводзіцца ДА ВЕДАМА ўсіх устаноў і працоўных што ТЭРМІН АТРЫМАНЬНЯ ДРОЎ ПА ОРДЭРАХ гартопу працягнуты да 1 ВЕРАСЬНЯ 1933 году.

ГАРТОП.

734—2—2.

Гарліт № 12. Друкарня „Камінтэрн“, Бальшавіцкая, 10. Адказны рэдактар А. М. КУРЦІК.